Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

23 СТУДЗЕНЯ 2007 г.
АЎТОРАК
№ 14 (25879)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Наша газета ўключана ў «Залаты фонд прэсы» СНД

Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю «Вельт ам Зонтаг» выклаў сваё бачанне ўзаемаадносінаў Беларусі і Захаду

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 22 студзеня даў інтэрв'ю нямецкай газеце «Вельт ам Зонтаг».

Пытанні, адрасаваныя кіраўніку дзяржавы, датычыліся, у прыватнасці, узаемаадносінаў Беларусі і Захаду, магчымасцяў выбудоўвання дыялога паміж Беларуссю і Еўропай, рэальнай падаплёкі беларуска-расійскай энергетычнай спрэчкі, праблем у будаўніцтве Саюзнай дзяржавы, сапраўдных прычын націску на краіну звонку з боку асобных сіл.

Сярод закранутых тэм — пытанні энергетычнай бяспекі ў Еўропе, неабходнасць выкаранення памылковых стэрэатыпаў, што склаліся аб Беларусі ў ЕС.

У час інтэрв'ю прагучалі шчырыя адказы Прэзідэнта на вострыя і даволі асабістыя пытанні.

«Вельт ам Зонтаг» — самая буйная нядзельная газета Германіі. Уваходзіць у сумесны пул са штодзённымі выданнямі «Дзі Вельт» і «Вельт компакт». Газета спецыялізуецца на аналізе падзей, што адбыліся на працягу тыдня ў палітычнай, эканамічнай, культурнай сферах, публікацыі эксклюзіўных інтэрв'ю. Належыць да ліку найбольш цытуемых выданняў Германіі. Чытацкая аўдыторыя ацэньваецца больш як у 1 млн чалавек. На працягу 2006 года на старонках газеты публікаваліся інтэрв'ю з вядучымі германскімі і замежнымі палітыкамі, дзелавымі людзьмі, уключаючы федэральнага канцлера ФРГ, прэм'ер-міністра Ізраіля, прэзідэнта Польшчы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Старшыню КНР з 15-годдзем беларуска-кітайскіх дыпламатычных адносінаў

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў 20 студзеня Старшыню Кітайскай Народнай Рэспублікі Ху Цзіньтао з 15-й гадавінай устанаўлення беларуска-кітайскіх дыпламатычных адносінаў. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што за мінулыя гады нашы краіны дасягнулі ўзроўню стратэгічнага партнёрства, фундаментам якога з'яўляецца традыцыйная дружба двух народаў.

Беларусь і Кітай нязменна займаюць падобныя пазіцыі па асноўных міжнародных праблемах, уключаючы ўзмацненне ролі ААН у сусветнай палітыцы, недапушчэнне ўмяшання ва ўнутраныя справы суверэнных дзяржаў, вырашэнне спрэчак і рознагалоссяў шляхам дыялога на аснове раўнапраўя і ўзаемнай павагі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што развіццё ўсебаковага супрацоўніцтва з Кітаем — адзін з асноўных прыярытэтаў беларускай знешняй палітыкі. У падпісанай 5 снежня 2005 года ў Пекіне Сумеснай дэкларацыі Беларусь і КНР ключавымі напрамкамі пашырэння ўзаемадзеяння вызначылі нарошчванне аб'ёмаў гандлю, наладжванне крэдытна-інвестыцыйнага супрацоўніцтва, развіццё навукова-тэхнічнага і ваенна-тэхнічнага патэнцыялаў, актывізацыю міжрэгіянальных сувязяў, ажыццяўленне культурных і адукацыйных праектаў.

Беларускі лідар выказаў упэўненасць, што рэалізацыя існуючых дамоўленасцяў дасць магчымасць нашым краінам у будучым дасягнуць яшчэ большых поспехаў у палітычнай, эканамічнай, навуковай, гуманітарнай сферах на карысць беларускага і кітайскага народаў.

Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў сваё запрашэнне Ху Цзіньтао наведаць Беларусь у зручны для яго час.

Аліна ГРЫШКЕВІЧ, БЕЛТА.

ЦЭНЫ НА БЕНЗІН: ПЛЮС 4,5—5 ПРАЦЭНТАЎ

З 20 студзеня ў рэспубліцы зацверджаны новыя свабодныя аптовыя цэны на нафтапрадукты і рознічныя цэны на нафтапрадукты, што рэалізуюцца праз аўтазаправачныя станцыі.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Паводле інфармацыі канцэрна «Белнафтахім», новая цана бензіну А-76 (Н-80), які рэалізуецца праз АЗС, цяпер складае 1470 рублёў за 1 літр (плюс 5 працэнтаў), 1 літр бензіну А-92 каштуе 1840 рублёў (плюс 4,5 працэнта), бензін А-95 — 2100 рублёў (плюс 5 працэнтаў), дызельнае паліва — 1470 рублёў (плюс 5 працэнтаў). Як зазначаюць спецыялісты, павышэнне цаны на нафтапрадукты звязана з ростам цаны на нафту з увядзеннем увазной мытнай пошліны на нафту Расійскай Федэрацыі.

Ігар ГРЫШЫН.

ДА МІНУС 17!

У бліжэйшыя суткі на тэрыторыю Беларусі пачне паступаць халоднае паветра са Скандынаўскага паўвострава, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава.

Ноччу ў многіх раёнах, а ўдзень месцамі, у асноўным па паўднёва-ўсходняй палавіне рэспублікі, пройдзе снег. На дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу панізіцца да 2—8 градусаў марозу, у Віцебскай вобласці — да мінус 12 градусаў. Днём будзе 1—6 градусаў ніжэй за нуль. Толькі ў паўднёва-ўсходніх раёнах будзе цяплей — ад нуля да плюс 3 градусаў.

Паводле слоў спецыяліста, 24 студзеня ў сувязі з перамяшчэннем паўднёвага цыклону ў Беларусі рэзка пагоршацца ўмовы на дворʼя. Чакаюцца снегапады, завірухі, на дарогах зʼявяцца снежныя заносы. Тэмпература паветра ноччу складзе 2—8 градусаў марозу, а па Віцебскай вобласці пры праясненнях — да мінус 15 градусаў. Днём — ад нуля да мінус 5 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у другой палавіне тыдня будзе зімовы характар надвор'я. Часам чакаецца снег. Тэмпература паветра 25 студзеня складзе ад 3 да 8 градусаў марозу. Пры праясненнях — да мінус 13 градусаў. Днём — ад 1 да 6 градусаў ніжэй за нуль. Усталюецца снежнае покрыва.

Да канца тыдня тэмпература паветра ў асноўным складзе 5—10 градусаў марозу. Пры праясненнях — мінус 14—17 градусаў. Днём будзе ад 2 да 8 градусаў ніжэй за нуль.

Пенсійная справа

ПРАВЫ ЛІЧАЦЬ ПА ЎЗНОСАХ

З 1 жніўня, часу прыняцця шэрагу змяненняў у пенсійным заканадаўстве, прайшло амаль паўгода. Тэрмін немаленькі. Тым не менш, мяркуючы па зваротах у рэдакцыю, даводзіцца канстатаваць: тэма новаўвядзенняў застаецца па-ранейшаму актуальнай. Такім чынам, якія новыя ўмовы заліку ў стаж з'явіліся ў нашай краіне, калі павялічваюцца пенсіі працуючых «датэрміноўшчыкаў» і як можна зарабіць працоўную пенсію грамадзянам, што працуюць за мяжой? З гэтым і іншым мы паспрабуем разабрацца з дапамогай начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сацстрах. Не менш за 5 гадоў

Першае і галоўнае новаўвядзенне — вызначэнне мінімальнай «планкі» часу работы з адлічэннем узносаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання для атрымання працоўнай пенсіі па ўзросту. Зараз права на такую пенсію ўзнікае толькі пры ўмове, што сам работнік, а таксама за работніка рабіліся выплаты сацстраху на працягу не менш чым 5 гадоў. Такім чынам, нават калі такая выплата рабілася 4 гады 11 месяцаў і 29 дзён, можна разлічваць толькі на адно — сацыяльную пенсію.

— Як і раней, сёння ў стаж працягваюць уключацца так званыя «крэдытныя перыяды» — служба ў арміі, час навучання на дзённых аддзяленнях вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў ці час догляду маленькіх дзяцей у межах 9 гадоў у суме, — зазначае Валянціна Каралёва. — Аднак стажу, які складаецца толькі з гэтых перыядаў, ужо недастаткова. Апроч іх, зараз неабходна мець 5 гадоў менавіта працоўнай дзейнасці са страхавымі адлічэннямі.

Больш шчыльнай «прывязкай» да выплаты ўзносаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання тлумачацца і іншыя змены. Так, сёння час атрымання дапамогі па беспрацоўю ўключаецца ў стаж абмежавана — не больш чым 6 месяцаў на працягу ўсяго жыцця. Ці яшчэ. Раней перыяд, калі жонка ваеннаслужачага пражывала разам з мужам у месцах, дзе адсутнічала магчымасць працаўладкавання, у стаж залічваўся. А вось зараз — ужо не.

Дарэчы, узгаданыя нормы дзейнічаюць з 1 жніўня. І датычацца ўсіх, хто звяртаецца па пенсію пасля гэтай даты.

Працоўнае знявечанне аплаціць «Белдзяржстрах»

Плаціць узносы — умова зразумелая. І разам з тым вядома: калі-нікалі рабіць гэта немагчыма нават пры ўсім жаданні. Да прыкладу, маюцца на ўвазе выпадкі, калі чалавек атрымаў цяжкую траўму ці захворванне на сваім працоўным месцы.

— За непрацуючых інвалідаў у працаздольным узросце ці атрымальнікаў дапамог па часовай непрацаздольнасці, якім прызначаны штомесячныя страхавыя выплаты як пацярпелым ад няшчаснага выпадку ці прафесійнага захворвання на вытворчасці, узносы на пенсійнае страхаванне робіць Белдзяржстрах. Таму перыяды атрымання страхавых выплат па лініі Белдзяржстраха ў стаж залічваюцца. І пры гэтым — залічваюцца менавіта ў «неабходны» 5-гадовы перыяд працоўнага стажу.

Няпоўны стаж з прапорцыяй

Між тым, што будзе ў выпадку, калі ў чалавека ўсё ж ёсць 5 гадоў працоўнага стажу. Аднак у той жа час ён не дасягнуў працягласці, неабходнай для прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросту ў поўным памеры. У прыватнасці, калі працоўны стаж з выплатай узносаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання ў жанчыны складае менш за 20, а ў мужчыны — менш за 25 гадоў?

— У такім выпадку прызначаецца працоўная пенсія пры няпоўным стажы, — заўважае Валянціна Каралёва. — Інакш кажучы, памер такой пенсіі будзе вылічвацца прапарцыянальна стажу, які ёсць у чалавека фактычна.

У Беларусі можна. Пры жаданні

Не сакрэт, што тысячы (а па некаторых ацэнках — дзесяткі тысяч) грамадзян Беларусі сёння працуюць за мяжой. У сувязі з новаўвядзеннямі, ці застануцца яны «за бортам» айчыннай пенсійнай сістэмы?

— Тут дзейнічае агульнае правіла, — кажа Валянціна Каралёва. — Грамадзяне Беларусі, якія працуюць за мяжой, атрымліваюць права на працоўную пенсію па ўзросту зноў-такі пры ўмове не менш чым 5-гадовага перыяду выплаты ўзносаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання ў нашай краіне ў добраахвотным парадку. Прынамсі, такое права ёсць зараз. Таму, калі ўзнікае жаданне мець працоўную пенсію ў будучым, ужо сёння, падчас работы ў Расіі, Казахстане ці Германіі, трэба зарэгістравацца ў органах Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва і рабіць страхавыя адлічэнні. Адпаведна, перыяды такіх адлічэнняў стануць залічвацца ў стаж. А сумы, з якіх яны здзяйсняліся, — у заробак для прызначэння пенсіі.

Праўда, пры гэтым варта мець на ўвазе, што добраахвотныя адлічэнні павінны рабіцца з сумы, не меншай за вызначаную ў нашай краіне мінімальную зарплату. Інакш сам стаж будзе разлічаны з памяншальным каэфіцыентам.

Умова адна — заробак

Да леташняга жніўня асобам, што працавалі ў калгасах ці сельгаскааператывах, год работы за год стажу залічваўся пры двух вельмі істотных умовах — выкананні мінімуму працоўнага ўдзелу і атрыманні заробку, на які налічваўся сацстрах, у памеры не менш за «мінімалку». Пры невыкананні ж аднаго з гэтых патрабаванняў стаж вылічваўся па фактычнай працягласці і з выкарыстаннем папраўчага каэфіцыенту.

— У той жа час для асоб, што працавалі ў іншых галінах (і ў тым ліку на прадпрыемствах сельскай гаспадаркі, але не ў калгасах) на стаж уплывала толькі сума заробку, на якую ішло налічэнне сацстраху, — нагадвае Валянціна Каралёва. — Словам, правілы аказваліся няроўнымі. Таму з 1 жніўня ўмова выканання працоўнага ўдзелу для заліку ў стаж у адносінах да членаў калгасаў была скасавана.

Пераразлік? Калі не будзе выплат

Істотная змена датычыцца пераразліку пенсій па ўзросту для грамадзян, што ўжо скарысталіся правам на пенсію за выслугу гадоў ці датэрміновую пенсію па ўмовах працы. Раней у выпадку, калі такія асобы працягвалі працаваць, яны маглі разлічваць на пераразлік свайго стажу — за час ад моманту выхаду на пенсію і да дасягнення агульнаўсталяванага ўзросту. Зараз жа такі пераразлік магчымы толькі пры ўмове неатрымання пенсіі ў гэты перыяд.

— Тут трэба мець на ўвазе наступнае, — адзначае Валянціна Каралёва. — Для тых, хто скарыстаўся правам на датэрміновую пенсію ці пенсію за выслугу гадоў, але не дасягнуў агульнаўсталяванага ўзросту, уведзена своеасаблівая «захоўная норма». Паводле яе, стаж, запрацаваны пасля прызначэння «льготных» пенсій да 1 жніўня мінулага года, па-ранейшаму будзе падставай для далейшага пераразліку працоўнай пенсіі ў любым выпадку. Новае правіла «неатрымання пенсіі» датычыцца толькі работы пасля 1 жніўня.

«Ваенны» час ужо залічаны

Нарэшце, таксама адметны момант — «знікненне» з заканадаўства нормаў, якія вызначаюць залік у стаж перыядаў, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной. Да прыкладу, перыядаў знаходжання на акупаванай тэрыторыі ці знаходжання ў канцлагерах. Чым тлумачыцца такое рашэнне?

— Падобнае рашэнне аказалася чыста фармальным, — кажа Валянціна Каралёва, — Справа ў тым, што ўсе грамадзяне, якія пражывалі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, сёння ўжо выйшлі на пенсію. А значыць, «ваенныя» перыяды ўжо ўключаны ў іх стаж.

Сяргей ГРЫБ.

Пытальнік

ДВА ГАДЫ ЧАКАЦЬ НЕ ТРЭБА

— Мой малодшы брат, які пражывае ў Ташкенце, тры гады таму выйшаў на пенсію па ўзросту. Зараз ён хацеў бы вярнуцца ў Беларусь. Аднак брату хтосьці сказаў, што ў такім выпадку ён зможа атрымліваць сваю пенсію толькі праз два гады. Ці так гэта на самай справе?

Л.Ф. ЮЧАНКА, *г. Клімавічы.*

Як паведаміла нашай газеце начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна Каралёва, права на пенсійнае забеспячэнне ў Беларусі маюць усе асобы, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі нашай краіны незалежна ад грамадзянства — інакш кажучы, гаворка ідзе непасрэдна аб грамадзянах Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзянах і асобах без грамадзянства. Такім чынам, Леанід Фёдаравіч, першае, што павінен зрабіць ваш брат у выпадку пераезду ў нашу краіну — гэта вырашыць пытанне з атрыманнем пасведчання на права жыхарства. Бо якраз гэтае пасведчанне і зʼяўляецца тым дакументам, што пацвярджае пастаяннае пражыванне.

Калі пастаяннае пражыванне будзе пацверджана, брат як пенсіянер мае поўнае права звярнуцца ў беларускія органы па прызначэнню пенсій па запыт сваёй пенсійнай справы з Ташкента і прызначэнне пенсіі ў Рэспубліцы Беларусь. Дарэчы, згодна з пагадненнем ад 13 сакавіка 1992 года «Аб гарантыях правоў грамадзян краін — удзельніц СНД у галіне пенсійнага забеспячэння» (гэта пагадненне ў тым ліку падпісалі і Беларусь, і Узбекістан), сама пенсія будзе прызначана паводле заканадаўства нашай краіны з дня звароту. Прычым трэба мець на ўвазе, што ў такой сітуацыі пенсія можа быць выплачана і за мінулы час — з дня спынення яе выплаты ва Узбекістане.

Супрацоўніцтва

ХОЧАЦЦА, КАБ МАРКУ БЕЛАРУСІ ТРЫМАЛІ НЕ ТОЛЬКІ БЕЛАЗЫ І ТРАКТАРЫ...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У дзень пятнаццацігоддзя з дня ўстанаўлення дыпламатычных адносінаў паміж нашай краінай і Кітайскай Народнай Рэспублікай на Мінскім паштамце было праведзена спецыяльнае памятнае гашэнне. Як падкрэсліла падчас яго **намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Беларусі Ніна Сямёнаўна ГАЎРЫЛАВА**, ва ўсім свеце выпуск паштовых марак, канвертаў — гэта выдатны рэкламна-прапагандысцкі сродак, які дазваляе заявіць аб палітычным суверэнітэце краіны, прыцягнуць увагу да яе гісторыі, культуры, славутасцяў. А ў канчатковым выніку — надзейнейшы метад стымулявання інтарэсаў дзяржавы...

Гэтая думка была горача падтрымана і саветнікам па палітычных пытаннях Амбасады КНР у Беларусі Цзян Сяоянам, які зазначыў, што для яго, прынамсі, паштамт з дзяцінства быў адным з любімых месцаў, бо, захапляючыся філатэліяй, можна атрымаць не толькі велізарнае задавальненне, але і шмат ведаў...

Паказальна, што спецыяльнае памятнае гашэнне з нагоды 15-годдзя дыпламатычных адносінаў адбывалася не толькі ў Мінску, але і ў Пекіне. А наогул, паводле меркавання начальніка аддзела краін Азіі Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь Аляксандра Якаўлевіча Ульячэнкі, апроч сталіц, мерапрыемствы да гэтай даты праводзяцца ў вельмі многіх гарадах абёдзвюх краін, што гаворыць аб узаемнай зацікаўленасці і плёне ў супрацоўніцтве.

...Пасля запланаваных урачыстасцяў госці мерапрыемства з цікавасцю наведалі сталічны паштамт, пазнаёміліся з паслугамі, якія можна там атрымаць, выказалі ўпэўненасць, што паток карэспандэнцыі паміж краінамі ні ў якім разе не будзе змяншацца. А што да лістоў, то іх цяпер можна адправіць яшчэ і ў спецыяльных канвертах выпушчаных у абарачэнне з нагоды гэтай даты.

Валянціна ДОЎНАР.

ISSN 1990-763X

9 771990 763008

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.01.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 140,00
1 еўра	2 775,69
1 латвійскі лат	3 979,17
1 літоўскі літ	803,97
1 чэшская крона	99,85
1 польскі злоты	722,48
1 расійскі рубель	80,69
1 украінская грыўня	422,84

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	26,5214
10 UAH	52,4263
1000 BYR	12,3744
EUR	34,4009

Курс у гандлёвых кампаніях (на 22.01.2007 г.)

USD	2210 / 2325

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Савет Рэспублікі прызначыў новых членаў Цэнтрвыбаркама

Учора адбылося пасяджэнне пазачарговай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, на якім сенатары далі згоду на прызначэнне Лідзіі Ярмошынай старшынёй Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў, а таксама прызначылі шэсць новых членаў Цэнтрвыбаркама.

Нагадаем, што паўнамоцтвы членаў цяперашняга саставу Цэнтрвыбаркама заканчваюцца 31 студзеня гэтага года. Сам састаў Цэнтральнай камісіі фарміруецца на парытэтнай аснове: па шэсць членаў прызначаюць Прэзідэнт краіны і Савет Рэспублікі. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка скарыстаўся сваім правам яшчэ напрыканцы мінулага года. Так, 26 снежня быў выдадзены ўказ аб прызначэнні членамі Цэнтрвыбаркама Лідзіі Ярмошынай, Надзеі Кісялёвай, Марыны Казловіч, Мікалая Лазавіка, Валерыя Міцкевіча і Уладзіміра Холада. Іншым указам Лідзія Ярмошына была прызначана старшынёй Цэнтрвыбаркама яшчэ на адзін тэрмін (а гэта пяць гадоў). Такім жа будзе гэты тэрмін і для іншых членаў Цэнтрвыбаркама, што былі прызначаны Прэзідэнтам.

А вось сярод членаў Цэнтрвыбаркама, якіх прызначаў Савет Рэспублікі, усе асобы раней у Цэнтрвыбаркаме не працавалі. Такім чынам, сенатары прызначылі наступных членаў Цэнтральнай камісіі: дырэктар гімназіі № 1 г. Мінска Наталля Бушная, намеснік начальніка ўпраўлення юстыцыі Гомельскага аблвыканкама Маргарыта Жорава, начальнік упраўлення арганізацыйна-кадравай працы Брэсцкага аблвыканкама Аляксандр Каляда, дырэктар па агульных пытаннях і ідэалагічнай працы ВА «БелаўтаМАЗ» Эдуард Падаляк, начальнік упраўлення грамадскіх аб'яднанняў Міністэрства юстыцыі Алег Сліжэўскі і начальнік упраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама Іван Шчурок.

Лідзію Ярмошыну прадстаўляў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Генадзь Нявыглас. Паводле яго слоў, яна ў асаблівых рэкамендацыях не мае патрэбы, бо ўжо больш за 10 гадоў з'яўляецца старшынёй Цэнтрвыбаркама, а працуе ў ім з 1992 года. Генадзь Нявыглас адзначыў, што на пасадзе старшыні Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына зарэкамендавала сябе высокапрафесійным юрыстам і прынцыповым палітыкам, вопытным кіраўніком. Пад яе кіраўніцтвам дастойна прайшлі ўсе важнейшыя палітычныя кампаніі. Паводле слоў Генадзя Нявыгласа, «Лідзія Міхайлаўна надае важнае значэнне таму, каб Цэнтрвыбаркам быў адкрытай структурай, якая чэсна і празрыста арганізоўвае сваю дзейнасць». Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта выказаў упэўненасць, што яна і ў далейшым будзе садзейнічаць умацаванню законнасці, фарміраванню ў Беларусі прававой дзяржавы, развіццю народаўладдзя. Са свайго боку Лідзія Ярмошына адзначыла, што галоўным прынцыпам дзейнасці Цэнтрвыбаркама з'яўляецца галоснасць. Яна паабяцала, што сама і члены Цэнтральнай камісіі будуць імкнуцца выконваць свае абавязкі па забеспячэнню выбарчых правоў насельніцтва нашай краіны.

Падчас пасяджэння пазачарговай сесіі Генадзь Нявыглас таксама павіншаваў членаў Савета Рэспублікі з 10-годдзем дзейнасці верхняй палаты парламента. Паводле яго слоў, гэты перыяд для беларускай дзяржавы быў вельмі значным. Ён адзначыў, што вопыт працы Савета Рэспублікі паказаў здольнасць парламента вырашаць новыя задачы па забеспячэнню стабільнага і паступальнага развіцця дзяржавы, галоўная з якіх — далейшае ўдасканаленне нацыянальнага заканадаўства, накіраванага на ўмацаванне прававых асноў нашага грамадства.

Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за значны ўклад у развіццё беларускага парламентарызму, фарміраванне і ўдасканаленне нацыянальнага заканадаўства ўзнагароджаны намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях Акружная Святлана Арцёмаўна, члены Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Баранава Наталля Пятроўна і Шэршань Пётр Пятровіч, член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню Чуйко Рыгор Пятровіч.

Сяргей КАРАЛЕВІЧ.

КАЛЯДА ЎЖО НА ДУБЕ

Толькі ў Бярэзінскім раёне ёсць звычай развітання з калядными святамі. Ён адбываецца 21 снежня і называецца «Цягнуць Каляду да дуба».

— *Каляда-калядзіца,*
добрая маладзіца,
Мы цябе адгулялі, мы цябе шанавалі, — спявалі жыхары вёскі Новіны, упрыгожваючы стужкамі і вяночкамі сноп жыта, уздымаючы яго на дрэва.

Сядзі высока, глядзі далёка,
Каб жыта не лажылася,
каб жыта каласілася...

Адрадзіла старажытны абрад кіраўнік Новінскага ДК Ніна КЛІМОВІЧ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

1200 гатункаў пшаніцы Леаніда Жыцянёва

Сёння Леанід Жыцянёў рэдка пакідае Целяханы надоўга. Ён тут нарадзіўся, вырас і пасля заканчэння сельгасакадэміі вярнуўся ў роднае мястэчка. Напачатку пяць гадоў адпрацаваў у калгасе «Расія», а затым пайшоў з гаспадаркі, бо не ўсё складвалася так, як хацелася.


Фота В. ГАПЕЕВА.

Чалавеку творчаму рэалізавацца ў калгасе было цяжка. Штодзённыя клопаты, пасяўныя, жніво, выкананне плана... не пакідаюць спецыялісту часу для творчасці, самарэалізацыі, роздуму. А падумаць было над чым. Л. Жыцянёў сабраў вялікую калекцыю гатункаў-узораў пшаніцы з розных кантынентаў. Рэальна гатункаў намнога больш, чым 1200, бо ў адным узоры пшаніцы можа быць некалькі гатункаў.

Вось і пайшоў Леанід Аляксеевіч у мясцовы Дом дзіцячай творчасці і арганізаваў там навуковую суполку «Колас». Пры Доме творчасці ёсць 12 сотак зямлі, на якіх і расце пшаніца з Эфіопіі, Самалі, Нарвегіі... і ўсім цікава, як будзе расці пшаніца ў нашых умовах. У суполцы не займаюцца чымсьці надзвычайным, нейкімі складанымі навуковымі распрацоўкамі: усё больш проста, перад «коласаўцамі» стаіць зусім іншая задача. Пра яе і расказвае кіраўнік.

— Што датычыцца калекцыі пшаніцы, то яна збіралася не за адзін год. Захапіўся я яшчэ ў студэнцкія гады, а ў цэлым пшаніца назапашвалася, каб ахапіць усю батанічную разнастайнасць, якая была на пачатак XX стагоддзя, бо ўжо ў першай палове мінулага стагоддзя пачалося бурнае развіццё прамысловасці, якое зрабіла свой уплыў і на сельскую гаспадарку. І тое, што селекцыянеравалася народамі розных краін, пачало знішчацца. Вось чаму неабходна захаваць усю гэтую біялагічную разнастайнасць для селекцыі, якая і сёння чэрпае неабходныя гены для навуковай працы. Пры такой наяўнасці гатункаў чалавеку цікава нават зрабіць геаграфічны экскурс у пазнавальным плане, не кажучы пра даследаванне. Вось усю гэтую калекцыю мы пракручвалі ў нашых умовах: як той ці іншы гатунак развіваецца. Трэба адзначыць, што некаторыя гатункі-узоры, сабраныя ў Эфіопіі ці Афганістане, нават не мелі назвы: там і сёння ўсё яшчэ стыхійнае земляробства. Многія гатункі мы высяваем на доследным участку, а ўсю калекцыю пасеяць у адзін год фізічна немагчыма. Таму рэальна ўдаецца вырасціць 300—400 сартоў пшаніцы. Неабходна захаваць іх у жывым выглядзе, бо калі яны не будуць здольныя ўзыходзіць, то згубяць каштоўнасць. Ёсць гатункі, якія сябе добра паказваюць у нашых умовах. Напрыклад, пшаніца з Эфіопіі дае добры ўраджай і ўстойлівая да хваробаў, але разам з тым ёсць і адмоўныя паказчыкі. Мы збіраем і назапашваем навуковы матэрыял па ўсіх сартах, вядзём гібрыдызацыю.

А вось наконт таго, каб вывесці нейкі свой гатунак, дык гэта нам не пад сілу, гэта праца для навукова-даследчых устаноў, дзе ёсць лабараторыі, сур'ёзнае абсталяванне і кадры.

У нас жа галоўная мэта — прыцягнуць дзяцей да справы, прывіць ім цікавасць і жаданне займацца навуковай працай, каб яны ад сваёй творчасці атрымлівалі задавальненне. І яшчэ адзін важны момант. Дзеці, якія займаліся ў нашай навуковай суполцы, ідуць вучыцца далей у гэтым накірунку — паступаюць у ВНУ на біялагічныя ці агранамічныя аддзяленні.

І ў гэтым мая асноўная задача, але разам з тым у нас ёсць вельмі цікавы матэрыял у батанічным плане. Мы маем такія разнастайнасці пшаніцы, якіх няма нават у знакамітым Пецярбургскім навукова-даследчым інстытуце імя Вавілава.

Здараюцца і казусы. Аднойчы прыйшоў кіраўнік раёна, паказаў на адзін гатунак і спытаў: «А вось калі пшаніца з гэтымі вялікімі каласамі будзе на нашых палетках?» Людзі ў нас прагматыкі, ім адразу дай вынік. Мы свае дасягненні за некалькі гадоў абагульняем і выстаўляем на рэспубліканскія конкурсы, на якіх і выяўляюцца самыя лепшыя і дастойныя навучэнцы. І мы там, як правіла, займаем першыя месцы. А калі так, то дзеці атрымліваюць прэміі з прэзідэнцкага фонду. І такіх у нашай суполцы ўжо пяць чалавек. Раней яны паступалі без экзаменаў у ВНУ па біялагічнаму профілю, а калі пачалося тэсціраванне, то гэта адмянілі, але пры роўных умовах перавага аддаецца ім. Адным словам, усё маё жыццё звязана з дзецьмі і сёння я без іх ніхто.

* * *

Л. Жыцянёў на дадзены момант сваім жыццём задаволены, бо калі праца не з'яўляецца цяжарам, то гэта ўжо многа. Хоць ёсць занепакоенасць: а што будзе з калекцыяй потым? Каму яе перадаць? Сын захапляецца тэхнікай, а дачка яшчэ малая і невядома куды яе пахіліць, а ў былых вучняў свой шлях. Тут важна, каб чалавек, закончыўшы інстытут, «прыкіпеў» менавіта да пшаніцы, а не да садавіны, агародніны ці нейкай іншай расліны. Ды і заканадаўства наконт захавання ўсіх гэтых калекцыйных фондаў яшчэ недасканалае.

А найбольш уражвае Леаніда Жыцянёва сама прырода.

— Калі праводзіш скрыжаванне раслін, то бачыш, як ідзе расшчапленне па прыкметах. Выяўляецца тое, чаго ты сам не сустракаў ніколі, не чакаў і нават не чытаў у сур'ёзных навуковых выданнях. З'яўляецца такі цікавы вынік, такое дзіва, што дух займае. І дзеля гэтага хочацца жыць і працаваць, — сказаў на развітанне руплівец з Целяхан.

Сымон СВІСТУНОВІЧ, *Івацэвіцкі раён.*

«Літаратурны конкурс «Звязды» невыпадкова называюць народным»

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 19 студзеня г.г.)

Пераможца літаратурнага конкурсу **Таіса СЯМЁНАВА** (апавяданне «Давясёлкі», 29 лістапада 2006 г.) працуе наменікам галоўнага рэдактара раённай газеты «Астравецкая праўда». Дарэчы, некалькі гадоў таму сярод пераможцаў конкурсу была і Ніна Рыбік, галоўны рэдактар гэтай райгазеты. Колькі талентаў узгадавала Астравеччына!.. Таіса Сямёнава прызналася, што нават не ўяўляла, што можа заняць 1-е месца:

— Для мяне перамогай быў сам факт публікацыі апавядання ў «Звяздзе»... У журналістыцы я з захапленнем працую ўжо 32 гады. Па прыкладу фотажурналіста «Звязды» Яўгена Пясецкага вяду рубрыку «Фотаслова». Але пішу вершы не да сваіх здымкаў, як Яўген, а да фотаработ нашага фотакора, пазаштатных фотааматараў... Пішу вершы, апавяданні. Апавяданне «Давясёлкі» — гэта рэальны сюжэт з жыцця маёй роднай вёскі. У аснове ўсіх маіх апавяданняў — рэальныя гісторыі.

Васіль ТКАЧОЎ, вядомы пісьменнік з Гомеля, стаў «сярэбраным» прызёрам конкурсу (апавяданне «Раб чмяля», 6 студзеня 2006 г.).

— Пяць гадоў таму я перамагаў у «звяздоўскім» конкурсе. Спадзяюся, праз пяць гадоў змагу чарговы раз «узяць вышыню». Хоць, скажу шчыра, зрабіць гэта будзе няпроста — трэба напісаць апавяданне яшчэ лепшае, чым «Раб чмяля». Гэты твор у многім аўтабіяграфічны... Апошнім часам я адышоў ад апавяданняў — у драматургію, у раман.

Андрэй СІДАРЭЙКА з вёскі Каравацічы Рэчыцкага раёна (апавяданне «Вальс чырвоных гронак рабін», 29 снежня 2006 г.) завочна вучыцца на 3-м курсе журфака БДУ, ён стаў «бронзавым» прызёрам:

— Конкурснае апавяданне я перапісваў ажно 6 разоў. Да ўдзелу ў конкурсе падштурхнула апавяданне школьніцы Валеры Саротнік «Галубіная Рэспубліка» (30 снежня 2005 г.). А калі прачытаў «Раб чмяля» Васіля Ткачова — і ўвогуле «загарэўся», падумаў: ці змагу і сам што вартае напісаць? У нашай вёсцы каля 800 жыхароў, дастаткова і моладзі. Я скончыў Лоеўскае педвучылішча — праўда, у школе сказалі, што ў мяне цікі голас, вучні не пачуюць... Працую качагарам у родных Каравацічах.

Нагадаем, што конкурс апавяданняў газеты «Звязда» — штогадовы.

Таццяна ПАДАЛЯК.

Умовы конкурсу змешчаны ў «Звяздзе» за 11 студзеня 2007 года.

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287-17-41

Як перааформіць чэкі «Маёмасць», атрыманыя ў спадчыну, на чэкі «Жыллё»?

У апошні час у рэдакцыю зноў пачасціліся звароты грамадзян з пытаннямі адносна чэкаў «Жыллё» і «Маёмасць», дакладней, магчымасцю выдзялення адных каштоўных папер з другіх. У многіх выпадках сітуацыя датычылася чэкаў, атрыманых у спадчыну.

У прыватнасці, Соф'я Юрчык з вёскі Вензавец Дзятлаўскага раёна паведаміла, што калі сям'я атрымлівала чэкі, дык на прапанове сельвыканкама яны былі афармлены на мужа ў выглядзе чэкаў «Маёмасць». У іх увайшлі і чэкі «Жыллё»: мужа, жонкі, дзяцей. Муж даўно пайшоў з жыцця. Ці магчыма цяпер неяк выдзяліць з гэтых чэкаў чэкі «Жыллё»?

Вольга Тупік са Слуцкага раёна паведаміла, што ў студзені 2003 года дзядуля напісаў заяву на выдзяленне з чэкаў «Маёмасць» чэкаў «Жыллё», але атрымаць апошнія не паспеў, бо пайшоў з жыцця. Цяпер такой магчымасцю цікавіцца спадчынніца. Спадарыня Данілевіч з Салігорскага раёна просіць падоўжыць тэрмін выдачы чэкаў «Жыллё». Маўляў, некаторыя вяскоўцы не паспелі іх атрымаць. Мы абагульнілі гэтыя запыты ў адну публікацыю. Спадзяёмся, што ўсе, хто тэлефанаваў у рэдакцыю апошнім часам, знойдуць тут адказ на свае пытанні.

Атрыманне грамадзянамі чэкаў «Жыллё» ў адпаведнасці з налічанай жыллёвай квотай ажыццяўлялася ў парадку, устаноўленым загадам Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Канстаціна Кулікова, калі ў бацькоў маюцца перарэгістраваныя чэкі «Жыллё», якія былі налічаны ва ўстаноўленым парадку, трэба проста звярнуцца да натарыуса — для афармлення дагавора дарэння. Пасля гэтага дачка заяўнікаў павінна наведаць аддзяленне банка і, у адпаведнасці з дагаворам дарэння і чэкамі, атрыманымі ад родных, адкрыць спецыяльны чэкавы рахунак на сваё імя. Пасля гэтага ёй выдадуць сертыфікат на чэкі. Ужо з сертыфікатам і копіяй дагавора дарэння ад бацькоў дачка заяўнікаў далей звяртаецца ў мясцовы выканкам, дзе прад'яўляе тыя самыя падараныя бацькамі чэкі. Выканкам праводзіць праверку: ці стаяла жанчына на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, падставы для дарэння чэкаў. Калі ўсё добра, выканкам прымае рашэнне аб індэксацыі чэкаў. Вось пасля гэтага іх можна выкарыстоўваць для рэканструкцыі, будаўніцтва жылля, напрыклад, або для пагашэння крэдыту, што браўся на гэтыя ж мэты. Ужо выканкам пералічвае на рахунак будаўнічай арганізацыі, прадаўца ці банка, як у нашым выпадку, грашовыя сродкі. Праўда, жанчыне яшчэ спатрэбіцца даведка аб суме доўгу на крэдыту.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Каб дачка магла выкарыстаць чэкі, іх трэба аформіць па дагавору

Дачка жыхаркі вёскі Рэдзігірава Лунінецкага раёна Ганна Міхайлаўна Качан пабудавала з дапамогай банкаўскага крэдыту ў Пінску кватэру, у якой зараз і пражывае. Частку крэдыту дачка заяўніцы хацела б пагасіць з дапамогай чэкаў «Жыллё», у тым ліку і падараных бацькамі. «У аддзеле жыллёва-камунальнай гаспадаркі райвыканкама ў дачкі запатрабавалі натарыяльна заверан дагавор дарэння. А як яго атрымаць? У свой час чэкі выдавалі проста па пісьмовай заяве — на падставе рашэння Савета народных дэпутатаў, як запісана ў паперах».

Паводле слоў кансультанта аддзела ўпраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Канстаціна Кулікова, калі ў бацькоў маюцца перарэгістраваныя чэкі «Жыллё», якія былі налічаны ва ўстаноўленым парадку, трэба проста звярнуцца да натарыуса — для афармлення дагавора дарэння. Пасля гэтага дачка заяўнікаў павінна наведаць аддзяленне банка і, у адпаведнасці з дагаворам дарэння і чэкамі, атрыманымі ад родных, адкрыць спецыяльны чэкавы рахунак на сваё імя. Пасля гэтага ёй выдадуць сертыфікат на чэкі. Ужо з сертыфікатам і копіяй дагавора дарэння ад бацькоў дачка заяўнікаў далей звяртаецца ў мясцовы выканкам, дзе прад'яўляе тыя самыя падараныя бацькамі чэкі. Выканкам праводзіць праверку: ці стаяла жанчына на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, падставы для дарэння чэкаў. Калі ўсё добра, выканкам прымае рашэнне аб індэксацыі чэкаў. Вось пасля гэтага іх можна выкарыстоўваць для рэканструкцыі, будаўніцтва жылля, напрыклад, або для пагашэння крэдыту, што браўся на гэтыя ж мэты. Ужо выканкам пералічвае на рахунак будаўнічай арганізацыі, прадаўца ці банка, як у нашым выпадку, грашовыя сродкі. Праўда, жанчыне яшчэ спатрэбіцца даведка аб суме доўгу на крэдыту.

Сяргей РАСОЛЬКА.

36,6⁰

ФРАНЦУЗСКІЯ ВУЧОНЫЯ АДКРЫЛІ НАТУРАЛЬНАЕ БОЛЕСУЦІШАЛЬНАЕ

Французскія вучоныя з інстытута Пастэра паведамілі аб адкрыцці натуральнага болесуцішальнага, якое змяшчаецца ў чалавечай сліне. Выяўлены фізіялагічны інгібітар дзейнічае ў шэсць разоў мацней за морфій. Вучоныя назвалі яго «опиорфин» (Opiorphin).

Калі даследчыкі выпрабоўвалі «опиорфин» на пацуках, якім быў уведзены вызываючы боль хімікат, 1 мг новага болесуцішальнага на кілаграм масы цела даў той жа эфект, што і 6 мг морфію. Паводле слоў вучоных, «опиорфин» няцяжка сінтэзаваць у вяліках колькасцях, бо няма неабходнасці ў вылучэнні гэтага рэчыва непасрэдна са слівы. Акрамя таго, вучоныя мяркуюць, што болесуцішальнае можа змяшчацца не толькі ў ёй. Таксама, лічаць вучоныя, магчыма стварэнне прэпаратаў, якія будуць уздзейнічаць на арганізм пацыента так, каб ён выпрацоўваў дадатковыя малекулы самастойна. Даследчыкі мяркуюць, што адкрытае імі рэчыва можа валодаць і ўласцівасцямі антыдэпрэсанту, але яго яшчэ трэба праверыць на наяўнасць пабочных эфектаў.

Кар. БЕЛТА.

Радок "ЗВЯЗДЫ" ў гісторыі краіны 1917-2007
сумесны праект з Дзяржаўным музеем гісторыі ВАВ

ГАЗЕТА ПЕРШАЙ ПАВЕДАМІЛА ПРА АДКРЫЦЦЁ МУЗЕЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ, ужо праз месяц пасля вызвалення Мінска

У жніўні 2007 года найстарэйшая беларуская газета «Звязда» адзначыць 90-гадовы юбілей. Увесь гэты час газета была сапраўдным летапісцам і люстэркам гісторыі Беларусі, жыцця народа. Адна з адметных старонак гісторыі самой газеты звязана з Вялікай Айчыннай вайной. «Звязда» выходзіла ў Мінскім падполлі, друкавалася ў партызанскай зоне, натхняла і яднала на барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі сотні тысяч суайчыннікаў. Вораг баяўся праўдзівага друкаванага слова. Таму што слова — зброя магутная... Невыпадкова «Звязду» называюць газетай-патрыёткай.

«Звязда» ўзнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны і Чырвонага Сцяга. Дзве вуліцы беларускай сталіцы названы ў гонар «звяздоўцаў» — рэдактара падпольнай «Звязды» Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Амельянюка і супрацоўніка даваеннай «Звязды» «беларускага Марэсьева» Аляксандра Русановіча. Помнік Уладзіміру Амельянюку і іншым «звяздоўцам»-падпольшчыкам стаіць на галоўнай плошчы Мінска — плошчы Незалежнасці. Паўтара года таму ў Мінску з'явіўся праспект газеты «Звязда» — Мінгарвыканкам падтрымаў прапанову народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна, якую ён выказаў ад імя чытачоў газеты розных пакаленняў.

У снежні 2006 года рэдакцыяй і музеем Вялікай Айчыннай вайны было прынята рашэнне аб ажыццяўленні сумеснага патрыятычнага праекта, прысвечанага 90-годдзю «Звязды» і 65-годдзю з часу выхаду першага нумара падпольнай «Звязды» ва ўмовах акупаванага нямецка-фашысцкімі захопнікамі Мінска. Гэта своеасаблівая пераклічка «звяздоўскіх» публікацый ваеннага часу з днём сённяшнім. «Мы можам прааналізаваць публікацыі газеты часоў вайны, выбраць найбольш цікавыя, адметныя эпізоды і звязаць іх з рэальнымі людзьмі — жывымі відавочцамі тых падзей», — адзначыў дырэктар музея Сяргей Азаронак у публікацыі «Кожны зможа пабыць у ролі журналіста партызанскай «Звязды» (9 снежня 2006 г.). Да юбілею газеты ў музеі плануецца адкрыць «інтэрактыўную» партызанскую зямлянку-друкарню — каб наведвальнікі мелі магчымасць «перанесціся» ў ваенныя ўмовы, паспрабавалі папрацаваць на рэальным друкаваным станку, які выкарыстоўвалі журналісты-партызаны.

Сумесны праект рэдакцыі і музея выклікаў вялікую цікавасць у чытачоў. Да пошукавай работы актыўна падключыліся вучні **гімназіі № 25 г. Мінска** пад кіраўніцтвам настаўніцы А. Пахвалёнай («Родная газета дапамагае і ў працы, і ў жыцці», 13.01.2007).

Цікавы ліст даслаў у рэдакцыю пенсіянер, былы выкладчык **Дзмітрый СМІРНОЎ** з г. Клімавічы Магілёўскай вобласці: «Я выпісваю і чытаю «Звязду» рэгулярна, раблю выразкі. Асабліва мне спадабаўся артыкул «Кожны зможа пабыць у ролі журналіста партызанскай «Звязды» за 09.12.2006 г. Гэту публікацыю я прачытаў двойчы з алоўкам у руках. Пахвальна, што ў год 90-гадовага юбілею газеты рэдакцыя вырашыла прааналізаваць работу сваіх папярэднікаў у самы цяжкі і вырашальны для нашай Радзімы час». Дзмітрый Васільевіч расказаў аб найбольш памятных эпізодах пачатку вайны ў Сянно, адкуль ён родам; пра настаўніцу Ульянавіцкай СШ Лідзію Савельеўну Кацэр, якая займалася падпольнай работай... «Цалкам згодны з пазіцыяй дырэктара музея Сяргея Азаронка: не трэба баяцца ганарыцца землякамі!» — піша Д. Смірноў.

Вучоны сакратар музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Галіна БАБУСЕНКА расказала:

— У фондах музея знаходзіцца на захаванні большая частка нумароў газеты «Звязда», якія выходзілі ў 1941—1945 гадах. Ужо грунтоўна намі прааналізаваны: за 1941 г. — 42 нумары, 1942 г. — 4 нумары, 1943 г. — 85 нумароў, 1944 г. — 24 нумары. Даследаванне газеты ў кантэксце сумеснага праекта «Радок «Звязды» ў гісторыі краіны» працягваецца.

Асноўны змест ваенных нумароў газеты — інфармацыя аб падзеях на франтах і ў партызанскіх атрадах, зводкі Саўінфармбюро, загады Сталіна, Указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні ордэнамі і медалямі франтавікоў і партызан, артыкулы пра баявыя аперацыі, подзвігі, пра жыццё на акупаванай тэрыторыі, а таксама пра становішча і падзеі ў іншых краінах. У газеце нямала публікацый вядомых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў: Янкі Купалы, Якуба Коласа, Пятра Глебкі, многіх іншых.

Прозвішчы воінаў і партызан, назвы населеных пунктаў, воінскіх часцей і партызанскіх атрадаў закадзіраваны адной літарай, таму дакладна ўстанавіць іх практычна немагчыма, акрамя некаторых Герояў Савецкага Саюза.

Унікальная гісторыя газеты часоў вайны. Сярод падпольных выданняў «Звязда» іграла вядучую ролю. У 1942 г. яна выходзіла ва ўмовах акупаванага Мінска. У 1943—1944 гг. — у раёне знаходжання камандавання Мінскага партызанскага злучэння на Загальскіх балотах, ва ўрочышчы Зыслаў Любанскага раёна Мінскай вобласці.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Вучоны сакратар музея Галіна БАБУСЕНКА і намеснік дырэктара Міхаіл СКАРЫНКА аналізуюць падшыўкі «Звязды».

Асобныя матэрыялы газеты перыяду вайны ўвайшлі ў экспазіцыю музея — напрыклад, у зале «Ідэалагічная работа на акупаванай тэрыторыі Беларусі» змешчаны «Зварот воінаў-беларусаў да партызан і партызанак, да беларускага народа», які быў апублікаваны ў «Звяздзе» 14 жніўня 1943 г., перад уступленнем Чырвонай Арміі на тэрыторыю Беларусі.

...Скажу шчыра: грунтоўны аналіз газеты «Звязда» за 1941—1945 гады асабіста для мяне зрабіў шмат адкрыццяў, хоць я працую ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ўжо 30 гадоў і добра ведаю фонды...

Прыемнай нечаканасцю стаў і **нумар «Звязды» за 5 жніўня 1944 года.** Практычна адразу пасля вызвалення Беларусі быў апублікаваны артыкул аб нашым музеі, што толькі рыхтаваўся да адкрыцця экспазіцыі. Значную частку яе складалі экспанаты і матэрыялы, якія пачалі збірацца яшчэ ў 1943 годзе (і ў гэтым таксама ўнікальнасць нашага музея). Газета пазнаёміла чытачоў з раздзеламі будучага музея, з асобнымі экспанатамі.

«У адным з лепш ацалеўшых будынкаў горада на плошчы Свабоды абсталёўваецца Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Айчыннай вайны. Вялікая група навуковых працаўнікоў, якая ў асноўным складаецца з былых партызан, праводзіць зараз работу па зборы экспанатаў і гістарычных дакументаў. У музеі створацца пяць асноўных аддзелаў».

«Аб жудасных днях гаспадарання гітлераўцаў у Беларусі будзе расказвацца ў аддзеле «Нямецкая акупацыя». Перад намі яскрава паўстануць малюнкі «Новага парадку ў Еўропе», які праводзіўся фашыстамі на беларускай зямлі...».

«Цэнтральнае месца ў музеі зойме аддзел «Партызанскі рух у Беларусі». Аб баявых днях і жыцці слаўных народных мсціўцаў апавядаюць шматлікія экспанаты і дакументы. Тут можна будзе убачыць пратаколы падпольных партыйных сходаў, тэксты прысяг, сцягі, партызанскія газеты і журналы, зборнікі вершаў паэтаў Усевалада Сабліна і Анатолія Астрэйкі. Тут жа будзе прадстаўлена шэсцьдзесят узораў аўтаматаў, вінтовак, мінамётаў, гранатамётаў, зробленых рукамі саміх партызан і цэлыя збройныя майстэрні, належачыя атрадам імені Суворава і «Буравеснік», дзе ўсё — ад ручніка да металаапрацоўчых варштатаў — было зроблена ў лясах.

Аб выдатных гістарычных перамогах савецкіх войск будзе апавядацца ў аддзеле «Чырвоная Армія — вызваліцельніца Беларусі». Пры гэтым жа аддзеле ствараецца выстаўка трафейнай зброі. Апрача «Тыграў» і «Пантэр», дзесяці-

ЗВЯЗДА
ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОУНАРКОМА І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР
№ 48 (7215) Субота, 5 жніўня 1944 г. Цана 20 к.
УБЯРОМ УРАДЖАЙ ХУТКА І БЕЗ СТРАТ!
Ад Совецкага інфо

ствольных мінамётаў і ўсёй іншай нямецкай ваеннай тэхнікі, тут будуць сабраны экспанаты французскай, галандскай, бельгійскай, чэхаславацкай, югаслаўскай, польскай, нарвежскай зброі, кінутай гітлераўскімі войскамі пры паспешным уцяканні з тэрыторыі Беларусі...».

— Галіна Дзмітрыеўна, магчыма, гэта была першая публікацыя аб адкрыцці музея?

— Так і ёсць. «Звязда» аднавіла свой выхад у Мінску ўжо 10 ліпеня 1944 года, адразу пасля вызвалення Беларусі... Афіцыйнае адкрыццё музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбылося 22 кастрычніка 1944 года.

І яшчэ адна цікавая публікацыя была прысвечана нашаму музею. 25 красавіка 1945 года, калі вайна ўжо блізілася да завяршэння, «Звязда» паведаміла чытачам аб тым, што музей атрымаў добры падарунак ад 2-га Беларускага фронту: вельмі цікавы, маляўнічы альбом загадаў Вярхоўнага Галоўнакамандуючага за студзень—красавік 1945 г., з малюнкамі, фотаілюстрацыямі, змястоўнай інфармацыяй. Над альбомам працавалі ў франтавых умовах і журналісты, і мастакі — вялікі калектыў салдатаў Перамогі. Гэты падарунак для музея — адзін з самых дарагіх. І дзякуй «Звяздзе», што інфармацыя аб гэтым факце перасягне не толькі дзесяцігоддзі — стагоддзі!

Паважаныя чытачы, магчыма, хтосьці з вас можа расказаць пра невядомыя альбо малавядомыя старонкі падпольнай «Звязды»? Будзем шчыра ўдзячны.

Таццяна ПАДАЛЯК.

ПЕРАСЯЛЕНЦЫ

УАДПАВЕДНАСЦІ з пастановай Савета Міністраў СССР ад 9 ліпеня 1946 года «Аб мерапрыемствах па засяленню раёнаў і развіццю сельскай гаспадаркі Калінінградскай вобласці», Савет Міністраў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б прыняў 20 ліпеня сваю пастанову, згодна з якой з Беларусі на добраахвотных пачатках неабходна перасяліць на пастаяннае жыхарства 2500 сем'яў калгаснікаў. Былі ўстаноўлены тэрміны перасялення: жнівень—кастрычнік 1946 г. Размеркаванне па абласцях выглядала наступным чынам. З Віцебскай вобласці — 425 сем'яў, Гомельскай — 400, Бабруйскай — 400, Магілёўскай — 425, Мінскай — 450, Палескай — 350 і з Полацкай вобласці — 50 сем'яў. Заходнія вобласці чамусьці ў гэту разнарадку не ўвайшлі.

Пастановай прадпісвалася накіраваць у ліку калгаснікаў 50 старшыняў калгасаў, 50 загадчыкаў жывёлагадоўчых фермаў, 50 брыгадзіраў, 29 трактарыстаў і 50 рахункаводаў. Устанаўлівалася, што з ліку калгаснікаў, якія падалі заявы аб перасяленні, у першую чаргу накіроўваць у Калінінградскую вобласць лепшых, якія маюць найбольшую выпрацоўку працадзён. Пры гэтым у складзе сям'і павінна быць не менш чым два працаздольныя члены. Па спісах перасяленцаў з Віцебскай вобласці, якія захаваліся, можна зрабіць выснову, што сярэдняя колькасць сям'і складала 4 чалавекі, але былі і шматлікія сем'і. Так, сям'я Абойна Майсея Цімафеевіча з Лепельскага раёна складалася з 10 чалавек, сям'я Крупянкова Івана Іванавіча з Аршанскага раёна — з 9 чалавек, сям'я Мідзюка Цімафея Міхайлавіча з Талачынскага раёна — з 8 чалавек, сям'я Казакова Дзмітрыя Паўлавіча з Чашніцкага раёна — з 7 чалавек і г.д.

Калгаснікі, якія добраахвотна ехалі ў Калінінградскую вобласць, атрымлівалі льготы. З іх знімаліся нядоімкі па абавязковых пастаўках дзяржаве сельскагаспадарчых прадуктаў, а таксама падаткі і страхавыя плацяжы. Перасяленцам рэкамендавалася перавозіць з сабой уласную свойскую жывёлу, птушку і пчоласем'і. Пры гэтым сем'і, якія не мелі скаціны і птушкі ва ўласным карыстанні, забяспечваліся каровай, дзвюма авечкамі, адным парасём, 5—10 птушкамі з фермаў калгасаў, членамі якіх яны з'яўляліся. Акрамя гэтага, Міністэрству гандлю БССР даручалася забяспечыць продаж кожнай сям'і перасяленцаў па дзяржаўных цэнах: аднаго палітво, 30 метраў баваўнянай тканіны, 10 літраў газы, 10 кг солі, 40 пачкаў запалак і кожнаму члену сям'і: адну пару абутку, адзін галаўны ўбор, па дзве пары шкарпэтак і панчох, 2 катушкі нітак і 1 кг мыла.

На дарогу таксама выдзяляўся сухі паёк тэрмінам на 10—15 дзён і 1 раз на суткі перасяленцы забяспечваліся гарачым харчаваннем. Выдавалася бязвыплатная грашовая дапамога ў памеры 1 тыс. рублёў на галаву сям'і і па 300 рублёў на кожнага члена сям'і.

Перавозка перасяленцаў ажыццяўлялася спецыяльнымі эшалонамі. Згодна з інструкцыяй начальніка перасяленчага эшалона, норма праезду складала 25—30 чалавек у адным двухвосевым вагоне. Акрамя гэтага, у саставе кожнага эшалона былі вагоны для скаціны, сена, асабістай маёмасці калгаснікаў, вагон-ізалятар, вагон-крама, вагон для абслугоўвання персаналу. Па плану аддзела перасялення і рэпатрыяцыі Савета Міністраў БССР для перавозкі калгаснікаў у Калінінградскую вобласць патрабавалася 20 эшалонаў, 1090 вагонаў, у сярэднім па 160 вагонаў на кожную вобласць.

Перасяленню папярэднічала вялікая масава-растлумачальная работа. Пры абласных і раённых выканкамах былі створаны камісіі, якія займаліся ўсімі пытаннямі перасялення. У калгасах праводзіліся агульныя сходы калгаснікаў, індывідуальныя гутаркі па азнаямленню з умовамі перасялення, з прыродных і эканамічных асаблівасцях месцаў Калінінградскай вобласці, з урадавымі льготамі для перасяленцаў. Пытанні перасялення асвятляліся ў мясцовым друку і па радыёвяшчальнай сетцы, выдаваліся спецыяльныя лістоўкі, дэманстраваліся фільмы.

Першы эшалон з Беларусі з калгаснікамі Мінскай вобласці адправіўся 18 жніўня 1946 года. У саставе налічвалася 60 вагонаў, у якіх размясцілася 150 сем'яў, жывёла, маёмасці і іншыя службы.

У цэлым работа па падрыхтоўцы і адпраўцы перасяленцаў праходзіла паспяхова. Аднак мелі месца выпадкі зрыву тэрміну адпраўкі, замены калгаснікаў служачымі або рабочымі, не забеспячэння жывёлай, фуражом і г.д. У сувязі з гэтым 11 кастрычніка 1946 года старшыня Савета Міністраў БССР П.К. Панамарэнка накіраваў кіраўнікам аблвыканкамаў наступную тэлеграму: «Перасяленне сем'яў калгаснікаў у Калінінградскую вобласць прахадзіць нездавальняюча. Растлумачальная работа адсутнічае... У выніку перасяленне ў Калінінградскую вобласць стаіць пад пагрозай зрыву. Абавязваю вас узяць пад найстражэйшы кантроль выкананне пастановы ўрада. Закончыць у кастрычніку адбор і адпраўку сем'яў калгаснікаў».

Своечасова прынятыя меры далі станоўчыя вынікі. У кастрычніку ў Савет Міністраў паступаюць з месцаў адна за адной тэлеграмы аб адпраўцы чарговых эшалонаў. Так, Віцебскі аблвыканкам паведамляе, што «па стану на 14 кастрычніка ў Калінінградскую вобласць адпраўлена 355 сем'яў, 19 кастрычніка адпраўляем апошні эшалон».

17 і 19 кастрычніка Гомельскі і Магілёўскі аблвыканкамы паведамляюць аб адпраўцы чарговых эшалонаў, а 25 кастрычніка з Бабруйска і Мінска адпраўлены апошнія эшалоны з сем'ямі калгаснікаў і жывёлай.

Не паспелі чыноўнікі апамятацца пасля напружанай работы па набору і адпраўцы калгаснікаў у Калінінградскую вобласць па пастанове Савета Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б ад 20 ліпеня 1946 года, як на падставе пастановы саюзнага ўрада Савет Міністраў БССР 26 кастрычніка 1948 года выносіць новую пастанову «Аб перасяленні калгаснікаў і іншага насельніцтва з БССР у саўгасы Калінінградскай вобласці». На гэты раз дзесяць абласцей рэспублікі абавязаны былі ў 1949—1950 гадах накіраваць 1000 сем'яў калгаснікаў і іншага насельніцтва, у сярэднім па 100 сем'яў ад вобласці. Дзве вобласці — Мінская і Віцебская — былі вызвалены ад адпраўкі перасяленцаў. У цэлым умовы перасялення заставаліся ранейшымі, за выключэннем таго, што на гэты раз маглі выязджаць сем'і не толькі калгаснікаў.

У дадзенай пастанове больш канкрэтна выкладаліся ўмовы рассялення перасяленцаў, якія прыбылі на месца. Кожнай сям'і ў месячны тэрмін пасля прыбыцця перадаваўся ва ўласнасць жылы дом або частка шматкватэрнага жылога дома з надворнымі пабудовамі, з умовай пагашэння перасяленцам затрат на рамонт і будаўніцтва з сум, якія ён атрымліваў у крэдыт. Крэдыт выдзяляўся да 10 000 рублёў на адну гаспадарку з наступным адняменнем 50 працэнтаў гэтых сум за кошт дзяржавы і з пагашэннем адной часткі пазыкі на працягу сямі гадоў, пачынаючы толькі з трэцяга года пасля атрымання крэдыту.

За кожнай сям'ёй замацоўваўся прысядзібны ўчастак у памеры 0,5 га. Выдавалася таксама доўгатэрміновая пазыка ў памеры 3000 рублёў для набыцця скаціны. Неабходна адзначыць, што на той час гэта былі нармальныя ўмовы. Можа, таму добраахвотнікаў паехаць з Беларусі было дастаткова. І тым не менш урад рэспублікі быў занепакоены ходам работ па адпраўцы перасяленцаў. 7 лютага 1949 года намеснік старшыні Савета Міністраў БССР К.В. Кісялёў дасылае дырэктыўныя пісьмы ў адрас старшыняў выканкамаў Маладзечанскай, Пінскай, Гродзенскай, Баранавіцкай і Брэсцкай абласцей з патрабаваннем «прыняць усе меры да выканання перас

«Прамая лінія» «Звязды»

Зямельнае пытанне патрабуе сур'ёзнага падыходу

Чытачам «Звязды» адказвае старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Георгій КУЗНЯЦОЎ

(Працяг. Пачатак у нумары за 20 студзеня).

☎ ***— Ад бацькоў мужа ў нас застаўся гараж у Лепелі. Гараж быў куплены даўно без дакументаў. Бацькі памерлі. Гараж знаходзіцца ў гаражным масіве, за яго спраўна плацілі зямельны падатак і за святло.***

Марына ГАЛКО,
г. Віцебск.

— Вам зараз трэба ўзяць даведку з гаражнага кааператыва, кіраўніцтва якога ведае, што гараж належыць вашай сям'і. На падставе даведкі трэба заказаць правядзенне інвентарызацыі паміж кання. Потым гэты аб'ект трэба зарэгістраваць у агенцтве па дзяржаўнай рэгістрацыі і кадастру. Пасля гэтага гараж можна прадаваць.

☎ ***— Калі будуць праведзены першыя аўкцыёны па продажы зямельных участкаў у Мінскім раёне і ўвогуле недалёка ад сталічнага мегаполіса? На якіх умовах будзе весціся такі продаж?***

Аляксандр РАЗАНЦАЎ,
г. Мінск

— Наш камітэт гэтае пытанне не вырашае. Рашэнне на аўкцыёнах прымаюць раённыя ўлады або кіраўніцтва сельскіх Саветаў. Зараз распрацавана палажэнне аб парадку правядзення аўкцыёнаў, якое сёння яшчэ не прынята. У праект палажэння былі ўнесены змяненні. Гэты дакумент прымае Савет Міністраў краіны па ўзгадненню з Прэзідэнтам Беларусі. Праект пастановы зараз цалкам падрыхтаваны і максімум праз тыдзень дакумент будзе мець юрыдычную сілу. Адразу пасля гэтага мясцовыя ўлады будуць мець магчымасць арганізоўваць продаж зямельных участкаў для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома.

☎ ***— Купіла хату ў гаспадыні ў лістападзе 2006 года. Хата была вельмі старой, а зараз я адрамантавала яе. Хачу дакументальна аформіць дом, але зрабіць гэта вельмі цяжка, бо ўласніца жыве ў г. Маладзечне. Былая ўласніца перадала мне ўсе дакументы на дом. Ці можна зараз аформіць дом па спрошчанай схеме, бо ён быў пабудаваны прыкладна ў 30-я гады? Праблема заключаецца яшчэ ў тым, што, згодна з дакументамі, дом аформлены на імя брата жанчыны, якая прадала дом, а ён памёр чатыры гады таму.***

Алена АЛЕЖКА,
вёска Брылькі Валожынскага раёна.

— Гэтую задачу можна вырашыць двума спосабамі. Згодна з першым варыянтам, прадавец нерухомасці павінен аформіць дом у спадчыну на сябе, пасля чаго можна афармляць здзелку куплі-продажу. У другім варыянце спадарыня Алежка з усімі дакументамі павінна звярнуцца ў суд, дзе вырашаецца права ўласнасці на яе імя.

— Але ж гэта працэдура ў судзе, напэўна, вельмі доўгая і складаная?

— Звычайна не. Суд павінен прызначыць права ўласнасці вызначанай нерухомасці за вамі. Суд будзе ўлічваць усе нюансы справы. Калі гаспадыня дома з'яўляецца прамой спадчынніцай брата і пацвердзіць гэта дакументальна ў судзе, то справа вырашаецца адносна хутка. Аднак калі ў брата засталася жонка і дзеці, тады дом частакова (або цалкам) будзе належаць і ім. Слушная парада вам і ўсім чытачам «Звязды»: купляючы хату або іншую нерухомасць, заўсёды патрабуйце ад прадаўца дакументы, якія ў поўнай меры і беспамылкова вызначаюць права ўласнасці на аб'ект. Абавязкова рэгіструйце нерухомую маёмасць на сваё імя ў агенцтве па дзяржаўнай рэгістрацыі і кадастру, а здзелку куплі-продажу — у натарыяльнай канторы.

☎ ***— У вёсцы Жыровічы Слонімскага раёна застаўся дом бацькоў. Бацька памёр 2 месяцы таму, маці — інвалід 1-й групы. Сястра ўзяла яе жыць да сябе ў г. Смаргонь. Я жыву ў Крупскім раёне. Як хутка і правільна аформіць дом бацькоў, каб потым яго прадаць? Наведваць вёску вельмі часта мы з сястрой не маем магчымасці. Маці засталася прамой спадчынніцай гэтай нерухомасці. Дом дагледжаны, зроблены са шлакабетону з водазабеспячэннем і каналізацыяй. Каля дома прыкладна 40 сотак зямлі. Гатовых дакументаў на дом і зямельны ўчастак няма. У сельскім Савеце ёсць запіс, што дом належыць бацькам. Як гэта арганізаваць?***

Валянціна КАРНЕЙКА,
Мінская вобласць.

— Калі дом не быў папярэдне зарэгістраваны, трэба браць даведку паводле інфармацыі пагаспадарчай кнігі і на яе падставе атрымліваць пасведчанне аб праве на спадчыну, якое потым неабходна зарэгістраваць у агенцтве па дзяржаўнай рэгістрацыі і кадастру. Трэба рабіць тэхнічны пашпарт будынка, афармляць зямлю, а потым рэгістраваць усё гэта цалкам у выглядзе ўжо аб'екта нерухомасці.

На практыцы гэту аперацыю па дому можна ажыццявіць значна прасцей. Звяртаецеся ў сельскі Савет, дзе дом ў пагаспадарчай кнізе перапісваецца на імя вашай маці. Пасля гэтага на падставе пісьмовай заявы вашай маці спецыялісты нашага камітэта зробяць абмер зямельнага ўчастка, тэхпашпарт на дом і зарэгіструюць аб'ект. Калі дом у пагаспадарчай кнізе будзе запісаны на імя маці і вы знойдзеце пакупніка на жыллё, то адчужэнне нерухомай маёмасці можна будзе зрабіць па спрошчанай схеме згодна з нормай Указа Прэзідэнта Беларусі № 368. Здзелку куплі-продажу дома па спрошчанай схеме сведчыць старшыня сельсавета бясплатна. Існуе толькі адно патрабаванне да пакупніка: новы гаспадар дома павінен ужо самастойна на працягу 6 месяцаў пасля даты куплі дома зрабіць тэхнічны пашпарт будынка, афармліць зямельны ўчастак і зарэгістраваць жыллё як аб'ект нерухомасці.

Сяргей КУРКАЧ.
(Працяг будзе).

СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА РАБОТНІКАЎ У СНЕЖНІ 2006 ГОДА СКЛАЛА Br668 ТЫС. 49

Налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Рэспублікі Беларусь у снежні 2006 года склала Br668 тыс. 49, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу. Для параўнання: у лістападзе 2006 года гэты паказчык складаў Br611 тыс. 482.

Паводле даных Мінстата, налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у снежні мінулага года была Br688 тыс. 621 (у лістападзе 2006 года — Br628 тыс. 636).

РАЁННЫЯ ГАЗЕТЫ З 2008 ГОДА — У КОЛЕРЫ

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў начальнік упраўлення вытворча-тэхнічнага развіцця Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Мікалай Брашко.

БЕЛАРУСЬ УЗМАЦНІЛА МЫТНЫ КАНТРОЛЬ НА БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКАЙ ГРАНІЦЫ ДЛЯ ГРУЗАЎ З КАЛІНІНГРАДА

Такое рашэнне прынята ў мэтах спынення незаконнага паступлення ў Беларусь замежных тавараў пад выглядам расійскіх, паведамілі БЕЛТА ў Дзяржаўным мытным камітэце Беларусі.

ПАДАЗРАЮЦЦА Ў ХАБАРНІЦТВЕ

Затрыманы намеснік старшыні Мсціслаўскага райвыканкама, які падазраецца ў хабарніцтве. Паводле папярэдняй інфармацыі, ён збіраўся атрымаць 500 долараў ад прадстаўніка камерцыйнай структуры і браўся ўрэгуляваць для фірмы пытанне аб ільготнай арэндзе нежылога памяшкання вялікай плошчы.

У Мсціслаўскім раёне таксама затрыманы старшыня райспажыўсаюза, які падазраецца ў атрыманні хабару. Папярэдне вядома, што ён атрымаў ад магіляўчаніна каля мільёна рублёў у якасці падзякі за водпуск цэменту з выдзеленай на раён квоты.

А ў Магілёве прама ў аўтамабілі на вуліцы, быў затрыманы мужчына, якога антыкрызісны кіраўнік ААТ «Гарбар» папрасіў стаць пасрэднікам у перадачы грошай. Падазраецца, што за 17,5 тысячы долараў ад аднаго з магілёўскіх прадпрымальнікаў антыкрызісны кіраўнік абяцаў паклапаціцца пра зніжэнне балансавага кошту некалькіх пабудоў, якія належаць прадпрыемству-банкруту.

Ул. інф.

Доктар адкажа

На гэтым тыдні асноўную нагрузку на «гарачай» тэлефоннай лініі Міністэрства аховы здароўя (222-70-80) возьмуць на сябе:

23 студзеня — намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» Алена Альбертаўна УЛЕЗКА.

24 студзеня — намеснік дырэктара па навуковай рабоце НДІ медыка-сацыяльнай экспертызы і рэабілітацыі Тэрэса Тадэушаўна КОПАЦЬ.

25 студзеня — намеснік дырэктара па трансфузіялогіі РНПЦ гематалогіі і трансфузіялогіі Эсфір Лазараўна СВІРНОЎСКАЯ.

26 студзеня — намеснік дырэктара па клінічнай рабоце РНПЦ дзіцячай анкалогіі і гематалогіі Аксана Мікалаеўна РАМАНАВА.

У графіку магчымыя змяненні.

ЗАЯВА

Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы ў сувязі з прыняццем у Эстоніі Закона «Аб ахове воінскіх пахаванняў»

Пастаянная камісія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы выказвае глыбокую заклапочанасць праявамі неанацысцкіх настрояў у Эстоніі. Менавіта гэтым, на наш погляд, абумоўлена прыняцце парламентам гэтай краіны Закона «Аб ахове воінскіх пахаванняў», які накіраваны перш за ўсё на ўстанаўленне прававой асновы для дэмантажу помнікаў загінулым савецкім воінам — удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. З аднаўленнем гістарычнай справядлівасці гэта не мае нічога агульнага.

Палітычная недальнабачнасць эстонскіх уладаў выклікае шчырае абурэнне ў тых народаў, чые сыны аддалі сваё жыццё, вызваляючы Эстонію ад фашызму. У нас таксама выклікае здзіўленне пазіцыя некаторых палітыкаў еўрапейскіх краін, якія адносяць сябе да носьбітаў дэмакратычных ідэй, аднак падтрымалі гэты закон.

Пастаянная камісія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы лічыць, што перакройванне гістарычнага мінулага садзейнічае адраджэнню рэваншызму, праяўленню прафашысцкіх настрояў. Мы заклікаем сусветную супольнасць даць прынцыповую ацэнку гэтай з'явы.

19 студзеня 2007 года, г. Мінск.

Хочацца спа-а-аць, не хочацца працаваць

Учора быў самы дэпрэсіўны ў гэтым годзе дзень

Фантазёры гатовыя назваць «самым дэпрэсіўным» ледзь ці не кожны дзень сёлетняй зімы. У нейкім сэнсе яны маюць рацыю, хоць рэальна, паводле даследаванняў, сезоннае дэпрэсіўнае расстройства назіраецца ў большай часткі людзей позняй восенню і ранняй зімой.

Чалавек — істота святлалюбівая, і таму зіму з адсутнасцю сонечных дзён, пахмурным надвор'ем, адным словам, гэты зімовы сезон, сапраўды можна называць больш дэпрэсіўным за іншыя. Паводле слоў загадчыцы аддзялення Рэспубліканскай клінічнай псіхіятрычнай бальніцы Валеры ПАГОСКАЙ, такія дэпрэсіўныя расстройствы суправаджаюцца павышанай санлівасцю, пачуццём стомленасці, стратай або ўзмацненнем апетыту, прычым у апошнім варыянце «цягне» пераважна на шкодныя для фігуры салодкія прысмакі. Медыкаментознае лячэнне пры такіх станах не прызначаецца. Дэпрэсія «баіцца» святла, шакаладу і любых, нават мізэрных, перамен. Так што карысныя будуць змены прычоскі, шопінг...

Святлана БАРЫСЕНКА.

Погляд

Крэмль «здаў» Беларусь пад ціскам Захаду?

Амбіцыі, тым больш не якія-небудзь, а самыя што ні на ёсць вялікаімперскія, як і шыла, у мяху не схаваеш. Угадваліся яны і за набіўшай аскоміну «спрэчкай гаспадарчых суб'ектаў» пад Новы год, і за «эканамічна абгрунтаванымі» экспартнымі пошлінамі на нафту для саюзнай Беларусі... На мінулым тыдні выказванні дзвюх у многім знакавых асоб расійскага істэблішменту развеялі апошнія сумненні.

Першым «засвяціўся» памочнік прэзідэнта Расіі Ігар Шувалаў. Падчас расійска-германскай сустрэчы ў Берліне 18 студзеня крамлёўскі чыноўнік так заўзята апраўдваўся за перакрыццё вентыля перад «нямецкімі партнёрамі» і з усіх сіл імкнуўся перакласці віну на «шантажыстаў», што банальна прагаварыўся. «Самі немцы пастаянна задавалі нам пытанне, калі ж пасля Украіны і для Беларусі мы ўвядзём рынкавыя цэны. Мы адкрыта абяцалі зрабіць гэта з першага студзеня 2007 года...», — прызнаваўся Шувалаў. Маўляў, самі прасілі, чаго ж на нас крыўдаваць?

Найбольш поўную і трапную ацэнку гэтым выказванням, на мой погляд, даў кіраўнік Першага нацыянальнага канала, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Аляксандр Зімоўскі:

«Я паважаю спадара Шувалава за смелыя выказванні пра тое, што Германія пераконвала Расію ўвесці рынкавыя цэны на газ для Беларусі, а цяпер яна быццам бы не разумее, што адбываецца. Толькі да чаго тады сарамлівыя кіўкі ў бок суб'екта гаспадарання — «Газпрама»? Трэба было шчыра і адкрыта сказаць расіянам і беларусам, што на Крэмль ціснуць і «здача» Беларусі — пытанне вырашанае. Гэта было б вельмі транспарэнтна, і, напэўна, пазбавіла б прэзідэнта Расіі ад неабходнасці публічна дэманстраваць даволі паверхневае веданне тонкасцяў фарміравання беларускага бюджэту. У мяне няма сумненняў у менавіта палітычнай аснове рашэння кіраўніцтва Расіі перагледзець адносіны з Беларуссю ў нафтагазавай сферы. І ўсе гэтыя перамовы вяліся на працягу 2006 года падчас старшынства РФ у «Вялікай васьмёркі». Пуціну, верагодна, патрэбна ў будучым безбалезненая легалізацыя на Захадзе ў якасці вельмі-вельмі-вельмі забяспечанага чалавека. Магчыма, у цану гарантый будучай яго недатыкальнасці ўваходзіць і спрыянне разбурэнню «беларускай мадэлі», і самога беларуска-расійскага інтэграцыйнага праекта». (www.naviny.by).

Другім «расплюшчыў вочы» народам суседніх з РФ дзяржаў вядучы перадачы «Однако» Міхаіл Лявонцьеў у «Нядзельным вечары» на НТБ. Натуральна, фігура куды больш дробная, аднак вядомая тым, што яе вуснамі даволі часта «глаголіць ісціна», прычым ісціна асоб уладных. Дык вось, спадар Лявонцьеў увогуле не разгледзеў на постсавецкай прасторы суседніх Расіі дзяржаў. Аказваецца, і Беларусь, і ўсе іншыя (асабліва — транзітныя) — гэта не суверэнныя самастойныя краіны, а «адарваныя» ў Расіі «нага», «рука», «вока» і іншыя ёй жыццёва неабходныя органы. І ставіцца да іх патрэбна адпаведна — як да свайго.

Даволі міленька Лявонцьеў панастальгіраваў па тых часах, калі былая імперыя — СССР — у выпадку непаразумення з іншымі дзяржавамі адразу ж «лупіла калатушкай па башцэ»: уводзіла танкі, падганяла марфлот... «Однако» да Беларусі ставіцца паблажліва: увесці ў склад імперыі ды ўся справа. І шчыра здзіўляецца апанентам: «А хто вам сказаў, што беларусы супраць?».

Абнадзейвае тое, што ў Расіі ёсць прыхільнікі і іншай стратэгіі ў адносінах з суседзямі. Згодна з ёй, партнёрам трэба прапанаваць дапамогу ў вырашэнні тых ці іншых праблем, а не махаць у іх перад носам дубінай. Вось толькі падобна на тое, што агучваюць гэтыя здаровыя сілы выключна ўласныя меркаванні, а не пазіцыю крамлёўскіх правіцеляў.

Уладзімір АЛЯКСАНДРАЎ.

Спорт-тайм

«Сесія» на пяцёрку

Пасля пяці дзён 23-й зімовай Універсіяды ў італьянскім Турыне ў беларускай каманды спартсменаў-студэнтаў пяць медалёў (тры залатыя, сярэбраны і бронзавы). Аўтаркай самай «свежай» перамогі стала біятланістка Дар'я Дамрачова, якая заняла першае месца ў спрынце на 7,5 кіламетра, апярэдзіўшы бліжэйшую саперніцу на 20 секунд.

«Вікторыя» прынесла перамогу

Зборная Беларусі па гандболу выйграла ва ўсіх трох сустрэчах першага кваліфікацыйнага раунда і прабілася ў плэй-оф чэмпіянату Еўропы. У брэсцкім спорткомплексе «Вікторыя» каманда Спартака Мірановіча перамагла малдаван (40:24), кіпрыётаў (31:23) і славакаў (29:27).

БАТЭ ў кроку ад чвэрцьфіналу

У стартавым матчы традыцыйнага міжнароднага турніру ў Маскве «Кубак чэмпіёнаў Садружнасці» барысаўскі БАТЭ аказаўся мацнейшым за таджыкскую каманду «Рэгар-ТадАз» — 2:0 (дубль у актыве Віталя Радзівонава). З такім жа лікам завяршылася наступная сустрэча беларусаў з другім саставам расійскага ЦСКА, але ўжо на карысць гаспадароў спаборніцтваў. Ці выйдуць падначаленыя Ігара Крыушэнкі з групавога этапу ў чвэрцьфінал, стане вядома сёння ўвечары пасля процістаяння барысаўчан і казахстанскага «Актобе» (далей праходзяць дзве лепшыя дружыны квартэта). Пакуль сапернік знаходзіцца на трэцяй пазіцыі з 2 ачкамі, а БАТЭ — на другім месцы з 3. Дарэчы, беларус Вячаслаў Глеб, які выступае за літоўскі «Каўнас», на 90-й хвіліне забіў у вароты грузінскага «Сіёні» пераможны гол, а яшчэ адзін наш легіянер, нападаючы ціраспальскага «Шэрыфа» Аляксей Кучук, дапамог выйграць у азербайджанскага «Бакы».

Трэнер выбраны

Новым галоўным трэнерам хакейнага клуба «Дынама» стаў 37-гадовы настаўнік маладзёжнай зборнай Беларусі Эдуард Занкавец. Ён змяніў на гэтай пасадзе славака Любаміра Покавіча, які ўзначальваў каманду з 2005 года.

Годны дэбют

Дэбютанты ралі Сяргей Шкель і Аляксандр Інус праехалі круг гонару вакол Руровага возера і фінішавалі на аўтамабільным марафоне «Лісабон-Дакар» на 105-й пазіцыі ў абсалютным заліку. Для навічкоў такі вынік выступлення вельмі паспяховы. Дарэчы, на 14-м этапе гонкі з-за спынення сэрца загінуў яшчэ адзін матацыкліст — француз Эрык Обіжу. Нагадаем, што на 4-м этапе разбіўся паўднёваамерыканец Элмер Сайманс, а на 13-м у аварыю трапіў іспанец Марк Кома, але застаўся жывым.

Валуеў наблізіўся да сусветнага рэкорда

Расіянін Мікалай Валуеў абараніў тытул чэмпіёна свету па версіі Сусветнай баксёрскай асацыяцыі ў суперцяжкай вазе. У швейцарскім Базелі ён засмуціў амерыканца Джаміля Маклайна тэхнічным накаўтам у трэцім раундзе. Дарэчы, Валуеў тры разы абараняў тытул, які заваяваў у снежні 2005 года, і наблізіўся да сусветнага рэкорда Рокі Марчыяна: той завяршыў кар'еру з 49 перамогамі, а на рахунку расіяніна іх ужо 46.

Бімка вандраваў восем месяцаў

Гэтага сабаку адна сям'я з Гомеля ўзяла з сабой у Чарнігаў, куды паехала да знаёмых у госці. Было гэта ў леташнім маі. І калі гамяльчане адправіліся назад у свой горад, Бімкі з імі не аказалася... Усе спробы знайсці яго закончыліся няўдачай нават пасля таго, як у Чарнігаве былі развешаны аб'явы аб матэрыяльным заахвочванні таго, хто верне хвастатага любімца гамяльчан.

Тыя ўжо страцілі надзею, каб убачыць Бімку, бо з часу яго знікнення прайшло восем месяцаў. І раптам ён з'явіўся перад акном гаспадароў, у двары шматпавярховіка — брудны, узлахмачаны, нямоглы. Дзе і як вандраваў Бімка, што ён перажыў за гэты час, як адолеў праз мяжу 90 кіламетраў і ўсё ж знайшоў дарогу дадому — застаецца невядомым.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Тры выданні аднаго аўтара

Незвычайная прэзентацыя адбылася ў Грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы: тры выданні аднаго аўтара выйшлі ў свет. Прычым аўтар — не «свабодны» пісьменнік, які па свайму жаданню будуе расклад дня і займаецца выключна творчасцю. Наталля Голубева — намеснік начальніка Упраўлення сацыяльна-культурнай сферы Апарата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук, член Саюза пісьменнікаў і Саюза журналістаў Беларусі, аўтар шматлікіх навуковых прац...

Аповесць «Радимичи» (Мінск: Мастацкая літаратура, 2006) прысвечаная жыццю, каханню, ваенным паходам нашых далёкіх продкаў — радзімічаў. Прыгожы, маляўнічы буклет «Радимичи» — сведчанне пераемнасці традыцый у сучаснасці. У ім выкарыстаны матэрыялы фондаў Чачэрскага гісторыка-этнаграфічнага музея і Крычаўскага раённага краязнаўчага музея. Кніга «Судьбы изменчивые лики» (Мінск: Харвест, 2007) яшчэ раз нагадвае, што ў жыцці няма нічога выпадковага...

— Я паспрабавала прасачыць гісторыю нашага народа на прыкладзе племені радзімічаў, якое мела ўнікальныя абрадавыя традыцыі, цікавыя бытавыя звычаі, — падкрэсліла Наталля Голубева.

Ігар Лапцёнак, намеснік міністра інфармацыі Беларусі:

— Прыемна, што ёсць такія шчырыя людзі, апантаныя ідэяй беларушчыны... Наталля Голубева — пісьменнік і таленавіты, і пладавіты: не кожнаму ўдаецца на працягу года ажыццявіць такі «трыядзіны» праект. Гэта цікавыя кнігі цікавага аўтара...

Лілія Ананіч, першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі:

— Наталля Голубева — гэта творчы чалавек і творчы чыноўнік, з якім вельмі лёгка працаваць. Гэта наш досыць строгі куратар, але разам з тым у гэтай строгасці заўсёды вялікая доля дапамогі, што надзвычай важна... Мы добра пачынаем год: за няпоўныя тры тыдні 2007-га — ужо трэцяя прэзентацыя кніг, выдадзеных сістэмай Міністэрства інфармацыі. Гэта добры знак. Інфармацыя аб кнігах сёння запатрабаваная, ужо немагчыма ўявіць газетныя палосы без анонсаў новых кніг, новых спектакляў — усяго, што з'яўляецца складовым духоўнасці грамадства... Наталля Голубева — маладая жанчына і малады аўтар. Малады, але разам з тым сталы аўтар — па жыццёвай мудрасці, па ўменню ўважліва зазірнуць у глыб гісторыі і ў глыб душы... Надзвычай важна для моладзі, для падрастаючага пакалення ведаць свае вытокі, карані. Таму слова нашых пісьменнікаў павінна ісці ў масы...

Таццяна ПАДАЛЯК.

У СОСНАХ УПАЛА ВОДАНАПОРНАЯ ВЕЖА

Згодна з папярэднімі ацэнкамі, урон ад стыхіі ў сталічнай вобласці ў перыяд з 15 па 20 студзеня склаў каля 1 мільярда рублёў. Пра гэта рэдакцыі «Звязды» паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС.

У Любанскім раёне ў вёсцы Сосны ўпала металічная воданапорная вежа.

У выніку амаль 450 жыхарам прыватных жылых дамоў і 12 двухпавярховак давялося часова карыстацца калодзежамі. Водазабеспячэнне было адноўлена пасля падключэння рэзервовай лініі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЧЫГУНКА ПАД АБСТРЭЛАМ ПАДЛЕТКАЎ

На беларускую чыгунку некаторыя падлеткі, а падчас і пенсіянеры, прыходзяць у літаральным сэнсе з каменем за пазухай.

Паводле звестак намесніка начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў на транспарце Міхаіла Неліповіча, летась на чыгуначных аб'ектах было зарэгістравана каля 400 правапарушэнняў. Непаўналетнія вандалы кідалі камяні ў вокны цягнікоў, клалі на рэйкі пабочныя прадметы, трыбушылі сродкі сігналізацыі і сувязі. Агульная сума ўрону склала больш за 22 мільёны рублёў. Хуліганы стваралі часам рэальную пагрозу бяспецы чыгуначнага руху, а значыць жыццю і здароўю людзей. Нездарма ж, па 40 такіх фактах былі ўзбуджаны крымінальныя справы.

Праваахоўным органам удалося ўстанавіць палову «чыгуначных» хуліганаў. У асноўным гэта непаўналетнія. Аднак быў зафіксаваны выпадак, калі на такія «подзвігі» невядома па якой прычыне пацягнула і пенсіянера. Жыхар вёскі Меньхаўшчына Барысаўскага раёна зрабіў барыкаду з бярозавых бярвенняў на шляху цягніка «Львоў — Санкт-Пецярбург». Машыністу давялося прымяніць экстранае тармажэнне.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

кірмаш

штотыднёвы рэкламны выпуск

аддзел рэкламы
287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376
№ 3 (535)

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Прадаецца

■ Кватэра з майстэрняй у 2-кватэрным доме, які будуецца, пастаянная справа сямейнаму будаўніку без шкодных звычак (11 км ад Брэста).
Тэл. 8-025-901-69-81.

■ Прадам або абмяняю 3-пакаёвую кватэру ў г. Беразіно. Разгледжу любыя варыянты.
Тэл. (8-01715) 56-360.

■ Дом у Бярэзінскім раёне, г/п, лазня, сад, агарод 60 сотак, лес, рака.
Тэл. (8-017) 231-16-23.

■ Кабан вагой 150 кг па 4500 за кг.
Тэл. (8-01718) 3-03-15.

■ Бульбакапалка і касілка конныя, сумяшчальныя з трактарам.
Тэл. 8-029-699-80-87.

■ Трактар «Т150К» у Стаўбцоўскім раёне.
Тэл. (8-01717) 6-34-14.

■ Электратэльфер на 500 кг, новы.

Электрапеч для кухні (смажыць, варыць, пячы), выдатны стан, 70 тыс. руб.
Тэл. 8-029-325-67-07.

■ Электраплітa 2-канфорная з духоўкай, настольная, б/к, 100 тыс. руб.
Тэл. (8-017) 233-33-40.

■ Газавая пліта «Гефест» (Брэст), новая.
Тэл.: (8-017) 295-96-84, 8-029-654-11-62.

■ МТЗ-82Л, культыватар, РОУ-6, прычэп 4 тоны, 4900 у.а.
Тэл. 8-029-891-06-68.

■ Цыбуліны сартавых гладыёлусаў, нядорага.
Тэл. (8-01797) 36-710.

■ «Масквіч-412». Звяртацца: 223016 Мінскі раён, в. Новы Двор, 96.

■ «Фіят-тыпа» 1990 г.в., выдатны стан, або абмяняю на трактар.
Тэл. 8-029-183-44-70.

■ «Форд-эскорт» 1985 г.в., 1,6 Д, на хаду, патрабуецца невялікі рамонт кузава.
Тэл. (8-02157) 3-28-64.

■ ВАЗ-2106 1988 г.в. на з/ч, да «VW пола» 1993 г.в., рычаг перадач новы.
Тэл. (8-01793) 31-529, 8-029-578-56-86.

■ Супермлын, 4 кВт, 2000 кг/гадз.
Тэл.: (8-017) 253-55-40, 8-029-709-12-87.

Куплю

■ Плуг, капалку, акучнік, саджалку для МТЗ, «VW-пасат», дызель.
Тэл. 8-029-278-41-76.

■ Мотаблок МТЗ.
Тэл. 8-029-4000-852.

■ Руберoід наплавачны.
Тэл. 8-029-771-52-90.

■ Старыя фотаапараты, аб'ектывы, прылады і з/ч да іх.
Тэл.: (8-017) 253-24-41, 8-029-850-17-29.

■ Дом, якому не больш за 20 гадоў, або зруб вялікі для перавозу, будматэрыялы.
Тэл.: (8-017) 261-63-95, 281-70-00.

■ Прычэп і сельскагаспадарчае абсталяванне да мотаблока.

■ Тэл. 8-029-183-44-70.

Рознае

■ Сям'я здыме ў г. Мінску 1-пакаёвую кватэру, дом, 1/2 дома. Своечасовую аплату і парадак гарантую.
Тэл. (8-029) 362-55-58.

■ Прапаную шчанят чорных (1,5 месяца) ад маленькай сабачкі.
Тэл. у Мінску 294-46-44 (увечары).

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ
Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Тэлефон для даведак 287-17-79.

Пашпарт серыя_____ № _____ Выданы_____

Подпіс_____ Дата_____

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

ВІНШАВАННІ

Шчыра віншуем з 80-годдзем татачку і дзядулю ***Аляксандра Міхайлавіча ШЛЫКА*** *з в. Бярэжкі. Жадаем даўгалецця, спакою, дабра і цяпла.*

Сям'я Шлыкаў з Карэліч.

Віншуем любую дачушку ***Дзіяну Васільеўну ШЧЭРБАЧЭНЯ****, якая жыве ў Мінску, з днём нараджэння. Жадаем моцнага здароўя, шчасця ў жыцці, поспехаў у працы, верных сяброў.*

Родныя, в. Шчытковічы.



Віншуем з днём нараджэння ***Ірыну Іосіфаўну УРБАНОВІЧ****. Жадаем моцнага здароўя, доўгага настрою, міру, дабра і шчаслівых гадоў жыцця.*

Дзеці і ўнукі, в. Лаўскі-Брод.

Сардэчна віншуем з днём нараджэння ***Алену Мікалаеўну КАСЦЮКЕВІЧ*** *з в. Купіск. Жадаем шчасця, здароўя без лекаў, дабра і спакою і доўгага веку.*

Сям'я Міснікевічаў.

Віншуем любага і дарагога мужа і татачку ***Вікенцьевіча ДУДЗІЧА*** *з днём нараджэння, моцнага табе здароўя, удачы, павагі, дабра і цяпла.*

Жонка, дзеці, г.п. Воранава.

УП "Минский городской центр недвижимости"

информирует, что в извещении о проведении 31 января 2007 года 57-го открытого аукциона на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г.Минска следует читать:

32	Помещение № 218, в ОТЦ "Столица", пл. Независимости (склад)	252,30	3 490
33	Помещение, в ОТЦ «Столица», пл. Независимости (санузлы для посетителей)	204,60	2 831

ОАО «Управление механизации № 91»

извещает своих акционеров, что очередное собрание акционеров состоится 28 февраля 2007 года в 10 часов по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11.

Регистрация участников начинается с 9 часов по предъявлении документа, удостоверяющего личность.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах работы общества в 2006 году и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2007 год.
2. Отчет Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии о работе в 2006 году.
3. Рассмотрение бухгалтерского баланса и направлений использования чистой прибыли за 2006 год.

Утверждение дивидендов за 2006 год.

4. О направлениях использования чистой прибыли Общества в 2007 году.
5. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
6. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Тел. 226-77-63

Наблюдательный совет ОАО «Управление механизации № 91»

Филиал № 7 по производству сельхозпродукции ОАО «Белтрубопроводстрой»

на постоянную работу приглашает на конкурсной основе ведущего зоотехника, зоотехника-селекционера, управляющего фермой, оператора по искусственному осеменению скота.

Подробности по телефонам: (01772) 57-6-88, 43-4-31, 43-4-33.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион по продаже обращенного в доход государства административного 2-х этажного здания (общ. пл. 272 кв.м), расположенного: г. Березино, ул. Зеленая, 18. Нач. цена снижена на 20% и составляет 84 650 000 белорусских рублей. Полное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 09.09.2006 г. Аукцион состоится 08.02.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 07.02.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Контактные телефоны (8017) 2246134, (801715) 51564.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

У суд Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак ***Аляксеева Леаніда Антонавіча***, 10 снежня 1954 года нараджэння, ураджэнца вёскі Шчэгліца Магілёўскага раёна і вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства — г. Магілёў, в. Буйнічы. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычны асоб, якія маюць звесткі пра Л.А. Аляксеева, паведаміць іх суду Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Згубленае часовае пасведчанне афіцэра запасу № 204 на імя Глушко Аляксея Віктаравіча лічыць несапраўдным.

Згублены студэнцкі білет № 06433, выдадзены Акадэміяй управлення пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь на імя Максуль Вікторыі Уладзіміраўны, лічыць несапраўдным.

Гаспадарчым судом Брэсцкай вобласці па заяве мытні «Заходні Буг» 11.01.2007 г. узбуджана справа аб банкруцтве № 5—3Б/2007 і распачата конкурсная вытворчасць у дачыненні да індывідуальнага прадпрымальніка Турчанкі Сяргея Мікалаевіча (г. Брэст).

Патрабаванні крэдытораў і зацікаўленых асоб прымаюцца праз кіраўніка Паліў

Простыя рэчы

ДВОР

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КАЛІ сёння гавораць слова «двор», то гараджане найперш разумеюць пад гэтым словам тую тэрыторыю, якая прылягае да шматкватэрнага дома ці дамоў. Вяскоўцы ж — альбо комплекс жылых і гаспадарчых пабудоў, альбо ўчастак зямлі пры хаце, абгароджаны плотам ці сценамі будынкаў.

А ў сярэднявеччы дваром ці дымам называлася асобная гаспадарка, якая абкладалася падаткамі і павіннасцямі. Са старажытнасці ж дварамі называліся памесці, маёнткі, якія належалі князю, магнатам, шляхце. Былі нават спецыяльныя — у князя і магнатаў — загарадныя, паляўнічыя двары. Чым не сучасныя дачы? Зрэдку называліся яны яшчэ і дзядзінцамі.

За горкай панская пасада,
Як у вяночку, каля саду
Ў глыбі прасторнага дзядзінца
Стаяла збоку ад гасцінца.

Я. Колас.

У беларускім фальклоры, у беларускай літаратуры вельмі шмат такіх устойлівых выразаў: «узялі ў двор», «пайшла жаць у двор», «працавала ў двары», «паклікалі ў двор»... І без ніякіх вызначэнняў. І так зразумела, што двор гэты панскі. Двор у разуменні маёнтка існаваў на Беларусі на працягу многіх стагоддзяў. Яшчэ, напрыклад, на пачатку XX стагоддзя ў Беларусі было 10 тысяч двароў, якім належала 40 працэнтаў усёй зямлі, а мільёны сялян валодалі астатнім. Ці не гэта было адной з галоўных прычын рэвалюцый, якія раскалолі былую Расійскую імперыю?

Што да Заходняй Беларусі, дык тут падзел на двары і вёскі існаваў да 1939 года. Шмат яшчэ ў маіх родных мясцінах людзей, якія помняць, як іхнія бацькі ды і яны самі дзецьмі хадзілі ў панскія двары парабкаваць. Статыстыка сведчыць, што ў Заходняй Беларусі на 6 тысяч двароў прыпадала 3 мільёны гектараў, а на 350 тысяч сялянскіх гаспадарак — 2,4 мільёна гектараў. Але трэба заўважыць, што тагачасны польскі ўрад, абапіраючыся на колішнія сталыпінскія рэформы ў Расіі, праводзіў пэўныя рэформы ў землекарыстанні. Так званую парцэляцыю — продаж праз зямельны банк часткі памешчыцкай зямлі дробнымі ўчасткамі — парцэлямі, ліквідацыю цераспалосіцы і звядзенне ў адзін участак, на хутар, дробных сялянскіх палосак і іншае. Да 1939 года на хутары было расселена 200 тысяч сялянскіх двароў. Зразумела, што пасля прыходу савецкай улады панскіх двароў не стала. А пасля вайны многія з іх сталі апірышчам для ўзнікнення калгасаў і саўгасаў у Заходняй Беларусі. Дарэчы, само слова «двор» прыжылося і ў новым жыцці — «калгасны двор», «скацінны двор», «машынны двор»...

Але досыць пра панскае, звернемся да раднейшага нам, простага сялянскага двара. У XVI стагоддзі для яго азначэння ўзнік новы тэрмін — сядзіба альбо сяліба, аселішча. Звязана гэта з аграрнай рэформай 1557 года, так званай валочнай памерай. Сядзіба ўключала ў сябе жыллё селяніна, гаспадарчыя пабудовы, агарод, сад, двор. На Беларусі вёскі ў асноўным забудоўваліся дзвюма відамі сядзіб.

Сядзіба — вяночны двор. Гэта калі будынкі «звязваліся» ў квадрат ці прамавугольнік, своеасабліва замыкаліся.

Сядзіба — пагонны двор. Гэта калі будынкі выстройваліся ў адзін ці два рады. Сёння, зразумела, на сялянскай гаспадарцы няма патрэбы ў многіх ранейшых пабудовах, мяняецца аблічча сядзіб, але можна заўважыць, што ў нашых мясцінах нават новабудоўлі ў вёсцы маюць ухіл да «вяночнага» двара.

Ну а колькі ў беларускай і класічнай, і сучаснай літаратуры ёсць апісанняў сялянскіх сядзіб! Ды і як не быць. Беларускія літаратары, за адзінкавымі выключэннямі, выйшлі з-пад стрэх. А жылі ў сталіцы. Таму так шчымліва ў сваіх творах расказалі яны пра родныя сядзібы, апісвалі іх прыгажосць. У «Новай зямлі» Коласа сядзіба ўвогуле, нароўні з самой зямлёй, асноўным багаццем селяніна, з'яўляецца адной з галоўных і паўнапраўных гераінь. Першы раздзел паэмы Коласа апісанню яе і прысвечаны:

Вось як цяпер, перада мною
Ўстае куточак той прыгожы,
Крынічкі вузенькае ложа
І елка ў пары з хваіною...
.....
Прасторны, роўны двор вясёлы
Заўсёды поўны быў жывёлы.

Дварышча — гэта слова стала распаўсюджаным у вёсцы ў XX стагоддзі, ёсць яшчэ размоўнае — панадворак. Гэта той жа ўчастак з хатамі і дваровымі будынкамі, але гэта ўжо не самі будынкі, а менавіта кавалак зямлі ля іх.

З дварышча
толькі выйдзеш за такі —
Вясельных скрыпак
нават не чуваць.

Гэта ў Максіма Танка. Радкі паэта прывёў нездарма. Дварышча ў час вясельляў адыгрывала немалую ролю. Само вяселле прымяркоўвалася да пастоў. Зімою — паміж Калядным і Велікодным пастамі, летам зноў жа абмежаванне было ў час Пятроўскага і Успенскага пастоў. Зімою ў хаце, дзе праходзіла вяселле, з-за цеснаты танцаў арганізаваць не было як, прасіліся да суседзяў. А ўлетку таньчылі на дварышчы. Ды і ў любую пару года выходзілі «пахалададацца», пакуркуць на дварышча. Каб не ўздымаўся пыл — палівалі яго вадою. Яно, дварышча і ўвогуле ў сялянскай сядзібе ўтоптавалася, як ток. Столькі калёс, людскіх ног тут бывала. Напісаў пра гэта і ўспомніў расповед аднаго старога вяскоўца. Розныя і шматлікія віхуры прывзвычаілі вясковага чалавека хаваць самае каштоўнае ў зямлю. Паблізу хаты, на дварышчы. А людзі са зброяй, якія прыходзілі па гэта каштоўнае, мелі і такі спосаб пошуку. Палівалі зямлю вадой. Там, дзе зямля ўбітая — вада затрымлівалася даўжэй. Там, дзе нядаўна капаная — вада хутка прасочвалася. Помніце яшчэ анекдот даўніх ужо часоў. «Чаму ён у кутку свайго дварышча зямлю газай (карасінам) палівае?» «Ды там у яго кулямёт закапаны».

Але пра вяселлі. У райцэнтраўскім жыцці дварышча ў час вясельляў часта станавілася месцам танцаў таксама. Але пакаленне маіх сяброў ужо таньчыла на спецыяльных насцілах, якія для гэтай урачыстасці рыхтаваліся. Потым стала модным ставіць у дварышчах вайсковыя палаткі, дзе засцілаліся і сталы. Палаткі вайсковыя, вайскоўцаў у нас хапала, маглі ўмясціць і больш за сотню гасцей. Сённяшнія вяселлі зусім не падобныя на былыя вясковыя і нават нашы местачковыя. Сёння практычна ўсе вяселлі арганізуюцца ці ў кафэ, ці ў рэстаране. Заплаціў грошы — і ніякіх табе клопатаў. Закончылася ўрачыстасць — сабраліся, і дадому, дзе чыста, па-хатняму ўтульна. Нават большасць хаўтур цяпер арганізуецца так. Але ўсё роўна і перад вяселлем, і перад хаўтурамі, і перад якой іншай бяседай людзі збіраюцца ў дварышчы, выходзяць сюды «пахаладацца» і пакурыць.

Недзе ў семідзесятых напісаў верш пра празмерную «гасціннасць» сваіх местачкоўцаў, часы тады былі ледзь не застольныя. Заканчваўся ён так:

Мы б заўсёды зухавата,
Але ўсё гаспадары —
Ім жа госць, калі ён з хаты
Праз дварышча носам рыў.

Усё бывала, усяк вялося.

А быў жа яшчэ і «двор», які ў сваім значэнні мае месца быць і ў цяперашніх манархічных краінах — кароль ці іншы самадзержца і яго акружэнне. Ёсць і «прахадны двор» — калі гавораць пра якую-небудзь хату ці кватэру ці, як цяпер кажуць, офіс, дзе заўжды тоўпяцца людзі. А вось такое: «Ні кала, ні двара». Старажытны выраз. Зразумела з вышэйсказанага, двор — гэта сядзіба. Але пры чым тут кол? Аказваецца, раней была такая мера ворнай зямлі — кол. Так што прыказка пра чалавека, у якога ні зямлі, ні двара няма. Гэта ўжо жабрацтва.

А ў Купалы:

Прывяла гусляра
з яго ніўных сяліб
Дворня князева
ў хорам багаты.

Дзякаваць богу, цяпер нікога ні на які двор ніякая дворня не водзіць.

Алесь КАСЦЕНЬ,
Віцебская вобласць.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.11	16.32	8.21
Віцебск —	8.06	16.16	8.10
Магілёў —	8.01	16.22	8.21
Гомель —	7.51	16.25	8.34
Гродна —	8.25	16.48	8.23
Брэст —	8.19	16.56	8.37

Месяц

Першая квадра 26 студзеня. Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Анатоля, Макара, Паўла, Рыгора.*
К. *Марыі, Фернанды, Раймунда.*

Надвор'е на заўтра

Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

...у суседзяў

ВАРШАВА	-2 — 0 °C	МАСКВА	-8 — -6 °C
ВІЛЬНЮС	-5 — -3 °C	РЫГА	-4 — -2 °C
КІЕЎ	+5 — +7 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	-10 — -8 °C

Без ападкаў

Дзве даты

23 студзеня

1100 год — нарадзіўся Расціслаў Мсціслававіч, заснавальнік дынастыі смаленскіх князёў. Нашчадак кіеўскага князя Уладзіміра і полацкай княжны Рагнеды, унук Уладзіміра Манамаха. На працягу 40 гадоў быў князем смаленскім, заснаваў гарады Мсціслаў, Крычаў, пабудаваў Смаленскі крэмль. З 1159-га і да самай смерці ў 1167 годзе быў вялікім князем кіеўскім. Славіўся сваёй мудрасцю і справядлівасцю. Кананізаваны Беларускай праваслаўнай царквой.

1558 год — у адказ на адмову Лівонскага ордэна плаціць даніну Маскве рускае войска ўварвалася ў Лівонію, пачатак Лівонскай вайны (удзельнічалі Маскоўскае царства, Швецыя, Польшча, Вялікае княства Літоўскае за выхад да Балтыйскага мора). На 1-м этапе вайны, у 1561 годзе, Лівонскі ордэн быў разгромлены, аднак затым армія Стэфана Баторыя сваімі паспяховымі дзеяннямі змусіла Расію падпісаць нявыгадныя для яе Ям-Запольскае і Плюскае перамір'і.

Цытата дня:

«Людзі церпяць не за грахі, яны караюцца самімі грахамі. І гэта — самая цяжкая і самая правільная кара».

Л.М. Талстой.

УСМІХНЁМСЯ!

— Мілы, табе падабаецца гульня «Што? Дзе? Калі?»?
— Так.
— Ты хацеў бы ў яе згуляць?
— Так.
— Тады пачнём. ШТО ты рабіў учора ў гэтай распутніцы Зінкі? ДЗЕ ты бадзяўся пазаўчора? КАЛІ ты, мярзотнік, перастанеш трымаць мяне за ідыётку?

☺

Нічога так не развівае ваш слоўнікавы запас, як выпадковы ўдар малатком па пальцы.

☺

Экзамен па правілах дарожнага руху. Экзаменатар:
— Скрыжаванне, тут вы, тут аўтобус, тут матацыкл. Хто праедзе першы?
— Таксіст.
— Чаму таксіст?! Адкуль там узяўся таксіст?!
— А халера іх ведае, адкуль гэтыя таксісты бяруцца...

Карцінкі з натуры

СМАЧНАЕ маскоўскае жыццё

(Заканчэнне.
Пачатак у нумары за 20 студзеня.)

У тым жа гістарычным музеі штогод праходзіць фестываль шампанскіх вінаў, які арганізоўвае клуб «Вінаманія». Знаўцам гэтых вінаў прапануюваюць атрымаць асалоду ад шампанскага лепшых сусветных вытворцаў. А каб эфект задавальнення быў поўным, дэгустацыя гэтых вытанчаных вінаў суправаджалася і адпаведным багатым меню і музыкай, іншымі прыемнымі момантамі.

У былым купецкім асабняку ў гістарычным цэнтры сталіцы адкрыўся рэстаран «Абломаў». Рэстаран «Гадуноў» у адпаведнасці з той эпохай размясціўся ў трапезных палатах XVII стагоддзя. Тут рускі дух, руская кухня, рускія напоі, музыка і песні.

У сённяшніх маскоўскіх рэстаранаў у модзе прозвішчы слынных суайчыннікаў, якія пакінулі след у гісторыі. У невялікай па мерках сталіцы гасцініцы на 102 нумары «Арбат» (галоўная ж перавага — знаходжанне ў маляўнічым гістарычным цэнтры горада) ёсць залы «Скрабін» і «Пушкін». Па ўсяму гораду можна сустрэць прозвішчы славутых расіян. На вуліцы Няглінай месціцца пяцізоркавы гатэль «Пётр I», дзе лепшы рэстаран — «Раманаў». На Садовай-Трыумфальнай знаходзіцца рэстаран «Грыбаедаў», на плошчы Рэвалюцыі — рэстаран «Гадуноў».

А вось сучасныя прыхільнікі сумніўных «талентаў», бадай, самай цёмнай фігуры апошніх гадоў расійскай імперыі Рыгора Распуціна яго памяць увекавечылі ў назве аднаго з самых вялікіх і вядомых мужчынскіх клубаў «Распуцін». Думаецца, стары распуснік Распуцін быў бы задаволены шматграннай дзейнасцю клуба на ніве эротыкі. Можна толькі ўявіць, з якой бы асалодай гэты «святы чалавек» кіраваў на клубным балі, засядаў у журы конкурсу на лепшую стрыпцізёрку, адпачываў у фінскай, японскай і лазнях іншых народаў у кампаніі прыгожых юных грэшніц. Верагодна, ён пахваліў бы арганізатараў клубных эратычных касцюміраваных шоу, ацаніў бы знаходлівасць афарміцеляў залы «Камасутра», VIP-апартаментаў з джакузі і саўнамі, калекцыі эратычных фільмаў...

Застаўся б гэты «прадказальнік» лёсу царскай сям'і задаволены і экскурсіяй па іншых пажыўных месцах. Начное жыццё ў сталіцы віруе: казіно, масажныя кабінеты, чародкі «начных матылькоў» на пэўных вуліцах, клубы са стрыптызам non stop, з тэматычнымі вечарамі накшталт «Распусная Мальвіна», «Эратычныя казкі», праграмамі са сцэнамі лесбійскага кахання і мужчынскім стрыптызам. Апошняе Распуціну, які меў традыцыйную арыентацыю, магчыма, не спадабалася б. Але іншы час і іншыя захапленні ў Маскве.

Якія забавы — такія прымаўкі. «Шукаеце жанчыну? Шукайце грошы. Жанчына вас сама знойдзе!» — такі выраз пачуў ад маладой масквічкі. Не падумайце чаго! У нас размова ішла аб усеўладдзі грошай у Маскве, і яна, маці дваіх дзяцей, з мужам са скуры лезуць, каб забяспечыць сваёй сям'і прыстойнае жыццё, нагадала модны сёння ў сталіцы гэты выраз. Ён, калі хочаце, спрадвечная звычка масквічкоў з горкай іроніяй і чорным гумарам ставіцца да перыпетый лёсу.

Пасля актыўнага і насычанага адпачынку ў рэстаране або клубе заможнаму госцю ці жыхару сталіцы можна завяршыць вечар (ноч) у кампаніі прыемных табе людзей не абавязкова ў гасцінічным нумары ці ва ўласнай кватэры. «Новыя рускія», якія паважаюць сябе, для падобных мерапрыемстваў здымаюць апартаменты. Нярэдка на ўсякі выпадак, каб было куды завітаць. Цэны за арэнду розныя. Так, самы танны, бадай, варыянт — на Таганцы. Там 60-метровая з традыцыйным наборам выгод студыя на верхнім паверсе прапануюваецца за 3500 долараў у месяц. На Новаслабодскай 90-метровая студыя з двума спальнымі пакоямі ўжо каштуе 5000 долараў, крыху большыя апартаменты на Арбаце з трыма спальнямі — 7000 долараў. А вось за камфартабельныя 400-метровыя апартаменты на Мяшчэрскай (чатыры спальні) просяць 12 000 долараў, апартаменты на Цвятным бульвары — 20 000, а на Чыстых прудах — 30 000 штомесяц.

Сярэднестатыстычнаму прадстаўніку расійскай глыбінкі такія цэны няхай і за вельмі камфартабельнае жыллё з усімі «наваротамі» пакажуцца касмічнымі. Але ў Маскве да гэтых лічбаў ужо прывыклі. Там паміж багатымі і небагатымі (г.зн. звычайнымі людзьмі) пралягла нябачная сцяна, куды больш трывалая, чым некалі славутая Берлінская. Яе незадаволеныя жыццём берлінцы аднойчы сабраліся разам і на працягу сутак разбурылі. А вось сацыяльныя бар'еры, як сведчыць гісторыя, ламаюцца толькі эвалюцыйным або рэвалюцыйным шляхамі. Апошні ў гістарычным сэнсе аказаўся для Масквы не самым надзейным. На працягу мінулага стагоддзя там зноў узнік слой такіх багатых людзей, якіх белакаменная раней не бачыла. У Маскве бедныя і багатыя рэдка сутыкаюцца ў рэальным жыцці, яны нібы існуюць на сваіх уласных арбітах.

Смачнае маскоўскае жыццё моцна раздражняе расійскую правінцыю. Адтуль сталіца ўяўляецца багатай і самазадаволенай ганарыстай прыгажуняй, якая жыве і весяліцца без межаў, ад вельмі вялікіх грошай шалее з раскошы і г.д. і да т.п. У сваю чаргу масквічы зверху ўніз глядзяць на правінцыялаў. Гэту сітуацыю пацвердзіла шырокамаштабнае сацыялагічнае даследаванне Інстытута комплексных сацыяльных даследаванняў Расійскай акадэміі навук. З даследавання вынікае, што ў масавай свядомасці расіян сённяшняя Масква — гэта найперш багаты і жорсткі горад з вялікімі магчымасцямі для пэўнай катэгорыі людзей.

Большасць жыхароў правінцыяльных гарадоў лічаць, што Масква багацее за кошт усёй астатняй Расіі, а «сэрцам» Расіі сталіцу схільныя лічыць у асноўным самі масквічы. Яны ж, дарэчы, не згодныя з большасцю негатыўных ацэнак у свой бок, канстатавалі сацыёлагі.

Паводле іх даных, масквічы наступным чынам бачаць свой горад: для яго характэрныя кар'ера, адукаванасць, развіццё, дабрабыт, дзелавітасць, культура, насілле, энергія, інтэлект, ганарыстасць, наркотыкі. Правінцыя з гэтымі акцэнтамі фактычна згодная, але дадае яшчэ і «крывадушнасць». Цікавы момант: апытаныя жыхары Санкт-Пецярбурга па ўсіх паказчыках занізілі ацэнкі Маскве ў сярэднім на 10—15, а ў асобных выпадках нават на 20 працэнтаў, чым увогуле расіяне. Толькі 23 працэнты пецярбуржцаў лічаць Маскву «сэрцам» Расіі.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.



Рэклама «Распуціна» ў адным з маскоўскіх выданняў для замежных турыстаў.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО

БЕЛВНЕШЭКОНОМБАНК

Открытое акционерное общество «Белвнешэкономбанк», расположенное **по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32**, сообщает о проведении **1 февраля 2007 г**. Общего собрания акционеров в заочной форме.

На собрание выносится вопрос о предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

Акционеры банка могут ознакомиться с необходимой информацией и заполнить бюллетень для заочного голосования ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, **с 9.00 до 13.00 в течение семи дней со дня опубликования данного сообщения по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, ком. 707, а также в филиалах ОАО «Белвнешэкономбанк».**

Бюллетень для заочного голосования предоставляется не позднее 29 января 2007 г. по адресу: Республика Беларусь, 220073, г. Минск, ул. Скрыганова, 6. ком 707, почтой, нарочным либо по факсу (8-017) 209–25–48 с обязательной доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Дополнительная информация по телефонам:
(8–017) 209–24–21, 209–25–40.

У ДВУХ БАНКАЎ ПРЫПЫНЕНА ДЗЕЯННЕ ЛІЦЭНЗІЙ...

У двух банкаў, згодна з пастановай Савета дырэктара Нацыянальнага банка, прыпынена дзейянне агульнай і генеральнай ліцэнзій.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар галоўнага банка краіны, адпаведныя меры прадпрыняты ў дачыненні да ААТ «ІнвестПрамБанк» і ААТ «Міжнародны рэзервовы банк». У апошняга банка, акрамя таго, прыпынена дзейянне ліцэнзіі на прыцягненне ва ўклады сродкаў фізічных асобаў. Як патлумачылі ў Нацбанку, прыпыненне дзеянняў ліцэнзій у згаданых банкаў выклікана невыкананнем імі нарматыву бяспечнага функцыянавання, а менавіта давядзення да мінімальнага памеру ўласнага капіталу банка. З моманту прыпынення дзеяння ліцэнзій банкам забараняецца заключаць новыя дагаворы і перазаключаць на новы тэрмін раней заключаныя дагаворы, выкананне абавязацельстваў па якіх звязана з ажыццяўленнем банкаўскай аперацыі, у частцы ажыццяўлення якой дзейянне ліцэнзій прыпынена.

Ігар ГРЫШЫН.

Грошы, золата, камп'ютары...

Галоўным прызам першага тыражу новай грашова-рэчавай латарэі «Прынёманская» Навагодняя» стаў не аўтамабіль, а грошы на яго пакупку — 15 мільёнаў рублёў.

Менавіта такі варыянт палічылі аптымальным арганізатары латарэі. Справа ў тым, што быў выпадак, калі ўладальніца галоўнага прыза, пажылая жанчына, адмовілася ад машыны і патрабавала яе грашовы эквівалент.

Ад рэалізацыі білетаў «Прынёманскай» Навагодняй» было атрымана 155 мільёнаў 195 тысяч рублёў, а прызавы фонд склаў 70 мільёнаў рублёў. Шчасліўчыкі атрымалі тры камп'ютары, залатыя зліткі, мабільныя тэлефоны, тэлевізары і іншую бытавую тэхніку, было і шмат грашовых выйгрышаў.

Заснавальнікам новай латарэі, якая прыйшла на змену сваёй папярэдніцы — «Гарадніцы», таксама з'яўляецца Гродзенскі аблвыканкам. Сродкі ад продажу білетаў накіроўваюцца на вырашэнне сацыяльных пытанняў і развіццё спорту.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Знешні бок

БІЗНЭС-ЛІФТЫНГ, або Касметалогія без цудаў

Клінічныя цэнтры па касметалогіі функцыянуюць у кожным абласным цэнтры, у раёнах — адпаведныя кабінеты. У сталіцы ёсць і цэнтр, і кабінеты — на базе скурна-венералагічнага дыспансэра, цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння, плюс кабінеты ў прыватных медыцынскіх структурах. Часам касметалогія становіцца бізнэсам, а гэта можа нашкодзіць тым, хто давярае ёй сваё здароўе. Як жа захаваць і здароўе, і прывабнасць? Чаго не варта чакаць ад касметалогіі? Адказы на гэтыя пытанні шукайце ў інтэрв'ю з галоўным спецыялістам па касметалогіі Камітэта аховы здароўя г. Мінска, загадчыцай касметалагічнага аддзялення Клінічнага цэнтра пластычнай хірургіі і медыцынскай касметалогіі г. Мінска Нінай КІМ.

— Прафесія «касметолаг» была зарэгістравана ў нашай краіне толькі ў 1998 годзе. Ніна Канстанцінаўна, раскажыце, калі ласка, аб яе асаблівасцях.

— Пасля завяршэння вучобы на лячэбным факультэце медыцынскага ўніверсітэта трэба на працягу года працаваць урачом-стажорам і пацвердзіць тэрапеўтычную спецыялізацыю, далей пяць гадоў адпрацаваць урачом-дэрматавенеролагам і, нарэшце, атрымаць спецыялізацыю па касметалогіі на кафедры скурна-венералагічных захворванняў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. БелМАПА двойчы ў год выпускае 6 урачоў-касметолагаў. У Беларусі да касметолага прад'яўляюцца досыць высокія патрабаванні, таму высокакваліфікаваных спецыялістаў нямнога.

— Якія накірункі можна вылучыць у касметалогіі і ці можна лічыць яе больш эфектыўнай у параўнанні з дэрматалогіяй?

— Фундаментальная медыцына дзеліць касметалогію на тэрапеўтычную і хірургічную. Аднак у тэрапеўтычнай я б вылучыла яшчэ два накірункі: лячэбны і эстэтычны. Мы лечым усе скурныя захворванні — ад праблемнай скуры да выпадзення валасоў і дэрматозаў. Павінна заўважыць, што найбольш эфектыўны вынік забяспечвае камбінаванае лячэнне ў дэрматолага з выкарыстаннем касметалагічных працэдур.

— Калі пацыент звяртаецца да касметолага па лячэбную дапамогу, — напрыклад, каб выдаліць папіломы, хутчэй за ўсё, ён будзе задаволены вынікам. Аднак, напэўна, не вельмі проста дагадзіць пацыенту, які прыйшоў па эстэтычную дапамогу, для якой няма медыцынскіх паказанняў...

— Некаторыя пацыенты перакананыя, што самі цудоўна ведаюць, у якой дапамозе маюць патрэбу. Між тым, усім і кожнаму, хто прыходзіць да нас, мы рэкамендуем атрымаць папярэднюю кансультацыю. Такім чынам, бакі акрэсліваюць жаданні, магчымасці і наступствы. Нярэдка, скажам, да нас звяртаюцца людзі, якія апынуліся ў стрэсавай сітуацыі, перажылі няўдачы ў асабістым жыцці. Такім пацыентам здаецца, што працэдуры па амаладжэнню твару дапамогуць усё выправіць. На самай справе касметолаг тут не дапаможа: пацыент не пазбавіцца расчаравання і незадаволенасці, якім бы ні быў вынік маніпуляцый.

— А хто вінаваты, калі маніпуляцыі сапраўды прайшлі не лепшым чынам?

— На ўрача кладзецца вялікая адказнасць. Па-першае, ён не павінен брацца за праблему, у якой не бачыць магчымасці атрымання станоўчага выніку, а, па-другое, павінен адсеяць тых пацыентаў, якія неадэкватна ўспрымаюць касметалагічную дапамогу — вераць у цуд. Дрэнную паслугу тут аказвае рэклама. Яна сцвярджае, напрыклад, што на месцы рубца можа быць гладкая скура. А гэта нерэальна. Можна зрабіць шрам менш заўважным, але здаровую скуру мы не вернем.

— З «прафілактычнай» мэтай, да касметолага, напэўна, трэба звяртацца яшчэ ў падлеткавым узросце...

— Сапраўды, першыя яўныя праблемы са скурай праяўляюцца ў падлеткавым узросце. У адных яны з цягам часу знікнуць, а іншым саспяваюць жыццё, таму варта звяртацца па кансультацыю да касметолага, каб той прызначыў схему лячэння, догляду ў хатніх умовах. Трэба прыйсці на кансультацыю і для таго, напрыклад, каб 15-гадовая дзяўчынка і яе маці ведалі, што рабіць эпіляцыю ў такім узросце, — мякка кажучы, няправільна. Не скажу, што ў нашым цэнтры вам трэба праводзіць штодня і ўсё жыццё. Аднак мінімум ведаў пра догляд скуры аднойчы трэба атрымаць ад спецыяліста.

— Здаровая скура зараз наогул сустракаецца?

— Найчасцей сустракаецца адчувальная, алергічная. Справа ў тым, што на яе стан адмоўным чынам уплывае шэраг фактараў. Напрыклад, дрэнная экалогія, незбалансаванае харчаванне, жорсткая вада, сонца. Яны парушаюць абменныя працэсы, пазбаўляюць скуру вільгаці. Дрэнным чынам уплывае і тытунёвы дым. Кроў тады ўзбагачаецца не кіслародам, а вуглякіслым газам, што адбіваецца на колеры твару. На колер твару паўплывае, дарэчы, і парушаная работа страўнікава-кішачнага тракту. Важную ролю адыгрывае тут, безумоўна, і спадчынны фактар. Выпрывіць спадчыннасць немагчыма. Аднак гэта не азначае, што скуру не трэба даглядаць. Абавязкова не толькі ачышчайце яе — з дапамогай адпаведных геляў ці касметычных вяршкоў, але і ўвільгатняйце і абараняйце ад неспрыяльнага ўздзеяння навакольнага асяроддзя з дапамогай крэмаў. Прысвячайце гэтым працэдурам па некалькі хвілін раніцай і вечарам.

Фота Надзеі ЖУРАКОЎСКАЙ.

— Ці праўда, што крэм перыядычна трэба мяняць?

— Мяняйце... Пакуль аднойчы не атрымаеце алергічную рэакцыю, пазбавіцца якой будзе практычна немагчыма. Калі хочаце памяняць крэм, праверце яго ўздзеянне спачатку на невялікім участку. А ўвогуле калі ў наступны раз збіраецеся набыць вельмі дарагі касметычны прэпарат, прыгадайце, калі ласка, тое, што было сказана вышэй: цудаў у касметалогіі не бывае.

— Вы хочаце сказаць, што і тут, у касметалагічным цэнтры, працэдуры па амаладжэнню твару — дарэмная трата грошай?

— Да ўсяго варта ставіцца разумна. Па-першае, неабходна разумець, для чаго асабіста вам патрэбны падобныя працэдуры. Вы займаецеся бізнэсам? Дзелавое асяроддзе прад'яўляе да вашай знешнасці адпаведныя патрабаванні? У вас «няроўны шлюб»? У такіх выпадках ваша рашэнне можна зразумець. Па-другое, не забывайцеся, што вынік, які вы атрымаеце, трэба будзе «падтрымліваць». Няма працэдур, якія робяцца раз і назаўсёды. Па-трэцяе, калі вы чуеце пра чарговую новую методыку, распытайце касметолага пра пабочныя эфекты, падумайце пра наступствы. На маю думку, заўсёды павінна быць насцярожанасць у дачыненні да любых працэдур. Дарэчы, я ніколі не пераіла б эксперыментаваць нават з маскамі. Адкуль вы ведаеце, што іх кампаненты не справакуюць асабіста ў вас алергічную рэакцыю? Думайце пра адваротны бок. Скажам, вядома, што павярхоўны і сярэдні хімічны пілінг дае станоўчыя вынікі, а глыбокі, як аказалася, настолькі таксічны, што наўрад ці можна суаднесці карысць і шкоду. Таму ў нашай краіне ён нават не будзе сертыфікаваны.

— Сучасная касметалогія прываблівае, наколькі я заўважыла, і мужчын?

— Мужчыны цяпер і пластычныя аперацыі робяць, і на масажы ходзяць. Ім, як і жанчынам, хочацца схавацца за хоць бы візуальнай маладосцю. Нічога дрэннага ў гэтым няма.

Гутарыла Святлана БАРЫСЕНКА.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 409. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12